
Граніца ў Белавежы ☞ 3

# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

ПЁТР БОЖКА ☞ 4



http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 17 (2554) Год L | Беласток, 24 красавіка 2005 г. | Цана 2,00 зл.

*Самае каштоўнае — дэкламатары адкрылі невядомыя вершы нашых беластоцкіх беларускіх аўтараў: Надзеі Артымовіч, Алеся Барскага, Віктара Шведа, Міхася Шаховіча, Ніны Цыванюк...*

# Найбольшы росквіт

**Завяршыўся 34-ты выпуск цэнтральнага конкурсу беларускай паэзіі і прозы „Роднае слова”, які праходзіў 11 красавіка г.г. у Нараўцы.**

**Як вялікі можа ўчыніцца зрух вакол беларускага конкурсу найлепш адлюстроўвае школа ў Бабіках, што на Сакольшчыне. Да конкурсу прыступілі там упершыню. Ужо школьны агляд, дзе выступілі амаль усе навучэнцы, быў незабыўным святам. Прыехала „Ніва”, тэлебачанне... На раённы агляд, у Беласток, дэкламатараў давезлі самі бацькі. На цэнтральны, у Нараўку, парку бабіцкіх вучняў прывёз сам ксёндз. Разам з ім была і мама дэкламаткі Монікі, — як выявілася, дзяўчынка праваслаўная, і яна спачатку пабаялася ехаць з ксяндзом...**

**Пабываць у Нараўцы на „Родным слове” — прэстыж.**


Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Наймалодшая змена дэкламатараў з польска-беларускага прадшколля н-р 14 у Беластоку

— На другі дзень усе настаўнікі пытаюць як там нашы выступленні? Колькі прывезлі „месцаў”? — прыгадвае адна дэкламатарка, — найгорш вяртацца з пустымі рукамі...

Хоць на цэнтральным этапе бывае за сто выканаўцаў, стаць лаўрэатам не надта складана. Больш за палову выканаўцаў заваёўвае месцы і вылучэнні. Яны часта маюць „геаграфічны” характар. Вядома, ідзе тут пра падтрымку школ і настаўнікаў з вясковага асяроддзя, якім не пад сілу зраўняцца з Беластокам, Бельскам. З другога боку, арганізатары — Беларускае грамадска-культурнае таварыства, не хоча замыкаць дзвярэй перад дзяцьмі з вясковых і маламестачковых асяроддзяў — бо якраз там найбольш патрэбная іх падтрымка.

З другога боку, без іх нецікава.

Амаль усім дэкламатарам арганізатары рыхтуюць цацачныя і школьныя ўзнагароды (лепш калі б іх атрымалі ўсе дзеці — а самыя лепшыя дэкламатары кніжкі!), ды на канец года — ганаровыя граматы. Яны маюць дадатковае значэнне. У некаторых школах дырэктар узнагароджвае лаўрэата-дэкламатара і часам настаўніка. Колькі вынікі беларускіх конкурсаў адпаведна ацэньваюць асветныя ўлады, у школах сталі яны каштоўнымі і пажаданымі.

Конкурс паэзіі пазітыўна шакіруе сваёй масавасцю. Вось нараўчанскае мерапрыемства, якое можна назваць марафонам слова, трывала... дзевяць гадзін. Калі глядзець на апошніх дэкламатараў, тых што змагаюцца на школьным і раённым этапах — іх у пяць-сем разоў больш. Самае вялікае зацікаўленне сярод наймалодшых. Бываюць класы, дзе ўсе як адзін вучань хочуць выступаць.

***Конкурс не пазбаўлены хібаў. Самая таксічная праблема — жалезны састаў журы, які ад гадоў не мяняецца. Хоць у ім пераважаюць прызнаныя настаўнікі, не хапае тут літаратурна-акцёрскага бачання. Часта здараецца, што вучні настаўніка, які працуе ў камісіі, заваёўваюць найбольшыя ўзнагароды...***

Сёлета „Роднае слова” дасягнула свайго найбольшага росквіту. Выявілася новая якасць, якая сведчыць пра развіццё ідэі (увага — не ідзе тут пра ашаламляльную статыстыку). Самай моцнай і цікавай групай сталі гімназісты, якія яшчэ нядаўна выглядалі на сцэне „як апошнія з магікан”. Справа ў тым, што натуральнае зацікаўленне конкурсам, як прынцып, абрываецца на пятым класе. Нічога падобнага не скажаш пра цяперашніх гімназістаў. Наадварот, у гэтай катэгорыі найбольш было спелых, перадуманых, арыгінальных, нават індывідуальных выступленняў. Прытым не рэзала тэматыка твораў. Гімназісты гаварылі пра каханне, айчыну, пра жыццё... І самае каштоўнае — на маю думку — адкрылі невядомыя вершы нашых беластоцкіх беларускіх аўтараў: Надзеі Артымовіч, Алеся Барскага, Віктара Шведа, Міхася Шаховіча, Ніны Цыванюк... Адно, чаго не хапала тут да поўні — мізэрная, аднак, якасная колькасць мужчынскага полу. Калі ідзе пра гімназістаў — тон задае Беласток і Бельск. Чамусьці толькі сімвалічна ўдзельнічае Гайнаўка, якая ў сваю чаргу мае традыцыі і вялікі патэнцыял.

Конкурс не пазбаўлены хібаў. Самая таксічная праблема — жалезны састаў журы, які ад гадоў не мяняецца. Хоць у ім пераважаюць прызнаныя настаўнікі, не хапае тут літаратурна-акцёрскага бачання. Часта здараецца, што вучні настаўніка, які працуе ў камісіі, заваёўваюць найбольшыя ўзнагароды. Такое рашэнне — супраць стандартам, ды найбольш шкодзіць вучню.

Каб завяршыць сказанае на аптымістычнай ноце, прыгадаю прыклады з нашага панадворка. У Беластоку нараджаецца конкурс праваслаўнай паэзіі (здаецца, пад уплывам „Роднага слова”). Іх арганізацыйныя і інтэлектуальныя спробы вельмі нязладжаныя. Пры гэтай нагодзе дзеці, якія ўжо ведалі беларускі конкурс, паўтаралі: „Нашае „Роднае слова” сто разоў лепшае”. Гэта самая найлепшая ацэнка арганізатарам і душы конкурсу — Валянціне Ласкевіч!

**Ганна Кандрацюк**

## Простыя рэчы ☞ 2

Уладзімір Хільмановіч

*Хто сапраўды расчароўвае, дык гэта лідэры беларускай дэмакратычнай апазіцыі. Так бы мовіць, за дрэвамі яны часцяком не бачаць, ці не хочуць бачыць, лесу. Пасля прэзідэнцкіх выбараў 2001 года палітычныя „праўдадыры” хуценька забыліся пра рэгіянальных актывістаў, пра іх бядоты і патрэбы...*

## Папскае пакаленне ☞ 2

Аляксандр Вярбіцкі

*У апошніх тыднях вельмі часта прыгадвалася варшаўскае благанне папы ад 1979 года аб сашэсці Духа і абнаўленні аблічча гэтай ягонай зямлі. Мелася тут на ўвазе адмена ранейшага грамадска-палітычнага парадку. Лех Валэнса актуальна заявіў, што ў гэтай адмене — падзенні камуністычнага парадку — 60% удзелу Яна Паўла II і 30% яго, Валэнсы...*

## Інтэрв'ю з В. Манаевым ☞ 8

*Так гістарычна склалася, што беларуская мова на Беларусі вынішчалася. У 60-х гадах Хрушчоў сказаў, што Беларусь будзе першай савецкай рэспублікай. Менавіта савецкай — не рускай ці беларускай. Вялася сур'ёзная барацьба з беларускай мовай...*

## Выстаўка ☞ 9

Аляксей Мароз

*На вялікай колькасці фатаграфій паказаны святыя месцы Іерусаліма. Аўтары здымкаў прадставілі праваслаўныя цэрквы і іншыя будоўлі, якія належаць Іерусалімскай патрыярхіі і цудоўныя краявіды каля Іардана. Вылучаюцца фатаграфіі, якія рэпартажна паказваюць сыход Благадатнага агню да праваслаўных вернікаў...*

## Беларускі спорт ☞ 10

*Беларускі хакей пасля лютаўскай горычы ўжо паспеў зведаць пераможнай асалоды. Зусім нядаўна завяршылася турнірнае першынство краіны. Яго з поўным правам можна называць малым чэмпіянатам Усходняй Еўропы, паколькі ўдзел у турніры бяруць мацнейшыя клубы не толькі Беларусі...*

## Успамін ☞ 11

Юрый Трачук

*7 красавіка г.г. у варшаўскім шпіталі на 61 годзе жыцця адышоў ад нас вядомы літаратуразнавец, славіст-беларусіст, былы загадчык Сектара ўсходнеславянскіх літаратур колішняга Інстытута славяназнаўства Польскай Акадэміі навук у Варшаве і былы намеснік дырэктара гэтага ж Інстытута, а пазней ад'юнкт Вармінска-Мазурскага універсітэта ў Ольштыне, доктар гуманітарных навук Уладзімеж Стохель...*



# Простыя рэчы

*Беларусь стаіць на скрыжаванні эканамічных транзітных шляхоў і палітычных інтарэсаў. Заціснутая паміж усходнім палітычным тэрарызмам і фальшывым заходнім глабалізмам нібы паміж міфалагічнымі Сцылай і Харыбдай, яна, на думку некаторых, ужо не мае шанцаў на адраджэнне сапраўднай незалежнасці, сваёй адметнай культуры. Сённяшняя „беспрасветнасць" уводзіць многіх патрыётаў Айчыны ў скрайні песімізм, а некаторых нават у адчай. Адчуваецца гэта ў размовах, паставах і дзеях значнай часткі тых, хто яшчэ ўчора быў апантаны вялікай ідэяй вольнасці і справядлівасці. Але не трэба забывацца пра галоўныя фактары — жыватворныя сілы беларускага народа (каму гэты выраз смешны, можа далей не чытаць) і Боскі провід, дзякуючы якім жыве Беларусь і будзе жыць.*

*Хто сапраўды расчароўвае, дык гэта лідэры беларускай дэмакратычнай апазіцыі. Так бы мовіць, за дрэвамі яны часцяком не бачаць, ці не хочуць бачыць, лесу. Так, пасля прэзідэнцкіх выбараў 2001 года, калі была праведзена буйнамаштабная агульнанацыянальная кампанія, якая была максімальна дыскрэдытавана вярхушкай апазіцыі ў фінале, палітычныя „правадыры" хуценька забыліся пра рэгіянальных актывістаў, пра іх бядоты і патрэбы. Людзі зноў засталіся сам-насам са сваімі праблемамі, напрацаваная сістэма адкінута, а „лідэры" распачалі рыхтоўлю новых палітычных „бізнес-праектаў".*

*Сіла кожнай структуры, кожнай супольнасці ўгрунтавана і трымаецца на некалькіх рэчах. Найбольш падставовыя з іх — вартасць слова (трыманне дамовы) і міжасабовая салідарнасць. Віна і бяда беларускай апазіцыі найперш у тым, што яна за дзесяцігоддзе так і не здолела стварыць сістэму калектыўнай падтрымкі. У гісторыі чалавецтва ёсць процьма прыкладаў, калі за вялікімі лозунгамі ніхто не хацеў бачыць чалавека, які можа быць такім адзінокім і бездапаможным у гэтым бязлітасным і драпежным свеце. Таму важна проста любіць людзей, шанаваць сваіх, цаніць і дапамагаць аднадумцам.*

*Назіраючы за грамадскімі працэсамі, прыходжу да высновы аднак, што спакваля беларуская салідарнасць выспявае. Адзін з прыкладаў — апошнія падзеі ў Ваўкавыску вакол галадоўкі прадпрымальнікаў. Безумоўна, галадаванне — крайняя мера, часцяком неапраўданая. Але нельга не захапіцца асабістай мужнасцю людзей, якія пайшлі на такі крок. А сама галоўнае, што да акцыі сталі далучацца іншыя людзі, асабістыя інтарэсы якіх нібыта і не закранулі.*

*У грамадзянскай салідарнасці непатрэбныя гучныя словы заклікаў, патрэбны маленькія крокі і дробныя дзеянні. Папросту іх трэба рабіць: скінуцца па долары на вялікі штраф таму, хто несправядліва пацярпеў, выпісаць камусьці газету, у якой можна знайсці слова праўды, падарыць дзіцяці сябра беларускамоўную кніжку, падпісацца пад зваротам, які адпавядае тваім поглядам… Рэчы простыя і вядомыя, якія не патрабуюць значных высілкаў, выдаткаў ці асабістага гераізму. Менавіта яны і фармуюць лакальную грамадзянскую супольнасць, якая, на вялікі жаль, усё больш разбураецца з ростам урбанізацыі.*

*Сённяшні свет істотна змяніўся. Заедзь зараз у любы маленькі гарадок ці мястэчка, кшталту Друскенікаў ці Гайнаўкі. Гіпермаркеты выцясняюць малых вытворцаў, рытм жыцця прыспешваецца і людзям няма нават часу размаўляць паміж сабой. Тое ж, хіба непазбежна, будзе і ў Беларусі. А некалі чалавек мог зайсці ў маленькую крамку, паразмаўляць пра сямейныя справы, паразважаць пра навіны, узяць той ці іншы тавар у пазыку. Апошняе прымушала дбаць чалавека пра сваю рэпутацыю, бо хто пазычыць п'янюгу ці ашуканцу? Нехта можа ўгледзець у гэтай развазе наіўную сентыментальнасць местачкоўца, які настальгічна ідэалізуе мінулае, але тагачасны лад жыцця і быў класічнай еўрапейскай грамадзянскай супольнасцю, якую сёння трэба адбудоўваць. Адбудоўваць можна ў іншы спосаб, але па тых самых прынцыпах. Так, свет за апошняе стагоддзе істотна змяніўся, але прырода чалавека нязменная праз тысячагоддзі. А як сказаў адзін дасціпны яўрэйскі паэт: „Чым век падлей, тым ганару балей, таму, хто з ім ідзе, не па дарозе"…*

**Уладзімір Хільмановіч**
*(Гродна)*

# Пакаленне Яна Паўла II



*Апошнія тыдні грамадскае жыццё, асабліва ў нашай краіне, здамінаваў адыход у вечнасць папы Яна Паўла II. Нашы, польскія, медыі запоўніліся пафасным пакланеннем свайму суайчынніку; большасць замежных медыяў таксама аддала яму належны доўг. У справядлівасці гэтай з'явы нельга сумнявацца, бо пакойнік быў апосталам вялікай дабрыні. Аднак былі і скептычныя заўвагі пра праміналы пантыфікат, кранаючыя тэалагічных пытанняў, якія не ў маім полі зроку.*

*Пытанне ў мяне іншае: ці дабро можа выступаць самастойна без рэлятыўнага суправаджэння нечым адмоўным? Ці сённяшнія падзеі не з'яўляюцца, так як абагульняе адна з біблейскіх Саламонавых кніг, рэплікай мінулых падзей? Ці тое сёлетняе красавіцкае ўсхвальванне ў польскіх медыях у нечым не нагадвае не так даўно мінулых першамайскіх і ліпеньскіх пафасаў?*

*У апошніх тыднях вельмі часта прыгадвалася варшаўскае благанне папы ад 1979 года аб сашэсці Духа і абнаўленні аблічча гэтай ягонай зямлі. Мелася тут на ўвазе адмена ранейшага грамадска-палітычнага парадку. Лех Валэнса актуальна заявіў, што ў гэтай адмене — падзенні камуністычнага парадку — 60% удзелу Яна Паўла II і 30% яго, Валэнсы; гэтую заяву абнародавалі не толькі польскія медыі. (Яшчэ пару месяцаў назад той жа Валэнса пры нагодзе памінання Рональда Рэйгана галоўную ролю ў тым падзенні аддаваў колішняму амерыканскаму акцёру…) Мабыць, пафас згаданага колішняга благання зусім засеніў апублікаваныя ў канцы сакавіка вынікі апытання польскай моладзі: 60% маладых палякаў марыць з'ехаць у замежжа! Гаворачы больш літаральна: гэтыя сарамлівыя вынікі апытання былі старым звычаем падмецены пад палавік, „pod wycieraczkę". Як калісь пры першамайскай або ліпеньскай нагодзе іншыя няўручныя тэмы…*

*Можна дзівавацца такому стаўленню польскай моладзі, якая з масавым энтузіязмам успрымала свайго папу і адначасна з такой настойлівасцю хоча пакідаць сваю краіну. Але вялікага дзіву тут няма. Дуальная канструкцыя свету не абмяжоўваецца толькі да суправаджэння злом дабра, дуальнае і наша стаўленне да таго свету. Адно стаўленне афіцыйнае, паказное, а другое прыватнае, сапраўднае. І паміж імі вялікая зеўра. Маладыя людзі, якія напаказ так горача апладзіравалі папу, не надта свядомыя ягонага навучання; так як і іхнія продкі: яблык падае недалёка яблыні. Некаторыя каментатары польскай рэчаіснасці гэты дуалізм грамадскай свядомасці спіхваюць на спадчыну па чужым панаванні: па ранейшых падзелах Рэчы Паспалітай і таталітарным грамадскім парадку. Але ж тыя маладыя людзі, гэтая польская генерацыя JP2, генерацыя Яна Паўла II, выраслі ўжо пад мясцовым панаваннем, пад уздзеяннем заклікванай новай духоўнасці.*

*Маладыя людзі выраслі пад руплівым уздзеяннем спрактыкаваных старэйшых, якія са зменай грамадскага парадку прыстасаваліся да новых патрабаванняў, змяняючы толькі сваіх паказных куміраў. Змяняючы эмблемы, шыльды, назвы вуліц, назвы ўстаноў, „бяручы справы ў свае рукі". А маладыя людзі, насякнутыя духам родных гнёздаў, па інертнасці захоўваюць прызнакі рэлігійнасці, некаторыя нават трымаюцца веры. І выходзячы ў дарослае жыццё, калі хочуць пасталець і стаць на нейкі свой цвёрды грунт, як Ной на Арарат, заўважаюць навокал сябе патоп урачыстага вадалейства з вуснаў тых, што „ўзялі справы ў свае рукі". Што з паказной рэлігійнасцю шчыльна абступілі рэальнае карыта.*

*За апошняе чвэрць стагоддзя лік католікаў у Германіі паменшаў на два мільёны душ; лік тамашніх пратэстантаў — на тры мільёны. Некалі строга каталіцкае грамадства Іспаніі сёння здаецца саперніцаць з пратэстанцкім у праявах бытавой свабоды. Ды і ў Польшчы маладыя людзі лічаць прыемнае добрым.*

*Восем гадоў таму малады свет шчыра плакаў па трагічна памерлай Дыяне, жонцы брытанскага прынца Чарльза. 8 красавіка г.г. планаваўся ягоны шлюб з Камілай, якую паклоннікі Дыяны згадзіліся прыняць у лік новых куміраў. З-за пахавання ў той час папы прынц Чарльз адтэрмінаваў шлюб на наступны дзень.*

**Аляксандр Вярбіцкі**

**Тая частка Крыўлян, дзе планавалася лётнішча, стала б перш за ўсё месцам рэлігійнага культу. Маршалкоўская ўправа трымае ў запасе ўжо 13 мільёнаў злотых на мадэрнізацыю Крыўлян...**

# Аэрапорт ці месца культу?



*Шмат паказвае на тое, што на падбеластоцкіх Крыўлянах можа не быць аэрадрома — акна на свет падляшскага рэгіёна. Адзін з гмінных радных ад Права і справядлівасці Ян Дабжынскі на хвалі жалобы пасля смерці Яна Паўла II, з падтакваючым яму прэзідэнтам Беластока Рышардам Турам, выказаліся за тым, каб пакінуць там алтар, пры якім папа ў 1991 г. адпраўляў набажэнства. Радны ад ПіС хацеў бы, каб таксама тут узвялі храм, а наўкола — пасёлак жылых дамоў-катэджаў. Значыць, тая частка Крыўлян, дзе планавалася лётнішча, стала б перш за ўсё месцам рэлігійнага культу. На нішто здаўся факт, што Маршалкоўская ўправа ў паразуменні з беластоцкай Гарадской управай трымае ў запасе ўжо 13 мільёнаў злотых на мадэрнізацыю Крыўлян, для дастасавання таго месца на сучасны аэрапорт, які спачатку абслугоўваў бы кароткія таварныя і пасажырскія рэйсы, м.інш. таксама на паветраным шляху Беласток — Гродна.*

*Тым часам ад радасці пацірае рукі прэзідэнт Сувалкаў. Хоча ён, каб адкладзеныя грошы накіраваць у гэты горад і каб стуль у першую чаргу стартавалі самалёты, а затым сувальскае лётнішча прыцягвала б інвестараў. Так, як мела быць у адпаведнасці з канцэпцыяй аэрадрома ў Крыўлянах.*

*У сувязі з прапановай раднага Дабжынскага і прэзідэнта Тура, некаторыя вяртаюцца да ідэі пабудовы аэрадрома ў Тапалянах. Тая мясцовасць, аднак, аддаленая ад Беластока аж у 30 кіламетрах, не мае добрых даязных дарог і якой-небудзь інфраструктуры звязанай з магчымай пабудовай стартавай паласы і заплечча самога аэрадрома ды абслугі пасажыраў. „Вялікая адлегласць ліквідуе ўсе козыры звязаныя з эфектыўнасцю транспарту, ашчаднасці часу і набліжэння горада інвестарам ды турыстам", — напісаў нядаўна ў адной з газет падляшскі бізнесмен Адам Галяс. Дадаў прытым, спасылаючыся на даныя, што лётнішча на Крыўлянах не будзе цяжарам для навакольных жыхароў.*

*А Тадэуш Арлуковіч, прэс-інфарматар прэзідэнта Тура заявіў:*

*— Грамадства хоча, каб абдудаваць месца свяшчэннадзейства, значыць, неабходна прымаць пад увагу ягоную думку.*

*Спадар прэс-інфарматар спасылаецца на грамадства, не заўважаючы хоць бы вынікаў апытанняў, з якіх вынікае, што большасць апытваных выказваецца за аэрапортам на Крыўлянах. Мабыць, найлепшай развязкай у гэтай канфліктнай сітуацыі быў бы як найхутчэй праведзены рэферэндум. Хаця б дзеля таго, каб Ян Павел II не выкарыстоўваўся ў палітычных ці іншых гульнях. Тады таксама можна было б з чыстым сумленнем гаварыць, чаго хоча і чаго не хоча грамадства, нават калі ў гэтым рэферэндуме прыме ўдзел — як гэта бывае ў падобных выпадках — нязначны лік насельніцтва.*

**Мацей Халадоўскі**

# У Беларусь на ровары або пешшу

*Аляксей Байко (Белавежа): У мяне ёсць сямейнікі за мяжой. У мінулым прыходзілася ездзіць да іх нават праз Брэст. Зараз будзе магчымасць дабрацца да іх намнога хутчэй...*

**У час афіцыйнага адкрыцця Міжнароднага пешаходна-веласіпеднага пагранперахода Грудкі — Перароў не было турыстаў, якія з візамі адпраўляліся б у Беларусь. Сярод грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія прыбылі на польскі бок мяжы, былі толькі афіцыйныя госці. Аднак арганізатары мерапрыемства завяралі, што з гэтага моманту турысты могуць перасякаць польска-беларускую мяжу недалёка Белавежы. Будуць яны абслужаны ў кантэйнерах, якія стаяць каля дарогі. Падляшскі ваявода Марэк Стшалінскі абяцаў, што да канца года завершыцца будова пастаяннай інфраструктуры для абслугі перасякаючых граніцу грамадзян.**

На адкрыццё пагранперахода, якое адбылося 16 красавіка, прыбылі жыхары Белавежы і прыпушчанскіх мясцовасцей. Сярод запрошаных гасцей былі маршалак Сейма Уладзімеж Цімашэвіч, епіскап Гайнаўскі Міран, польскія парламентарыі і прадстаўнікі мясцовых самаўрадаў. Беларускую дэлегацыю ўзначальваў генеральны консул РБ у Беластоку Леанід Каравайка. Абяцаў ён, што турысты, якія наведаюць Рэспубліку Беларусь, будуць маглі свабодна перамяшчацца па Белавежскай пушчы. Паінфармаваў таксама, што візы можна будзе аформіць з дапамогай працаўнікоў гасцініцы „Зуброўка" ў Белавежы.

— Адкрыццё пагранперахода з'яўляецца для нас гістарычным момантам і трэба яго выкарыстаць. Трэба, каб ён спрычыніўся да больш актыўнага супрацоўніцтва паміж грамадскасцямі па абодвух баках мяжы, — кажа Валянцін Цэлевіч з Грудак, аддаленых на два кіламетры ад мяжы.

— Гэты пераход павінен быць адкрыты ўжо даўно. У нас за мяжой сем'і і магілы продкаў. Цяпер будзе так, як павінна быць, — заяўляе Браніслаў Паляшук, які таксама жыве ў Грудках.

Рашаючыся хутка адчыніць пераход праз мяжу з выкарыстаннем кантэйнераў чыноўнікі абмежавалі магчымасць арганізавання пратэстаў экалагічнымі арганізацыямі. Раней па Гайнаўшчыне распаўсюджваліся лістоўкі, у якіх крытыкавалася ініцыятыва арганізавання пагранперахода ў цэнтры Белавежскай пушчы. Эколагі прапанавалі наладзіць праезд праз мяжу побач пушчы. Зараз, калі пераход будзе працаваць, цяжка будзе спыніць яго дзейнасць.

— Я думаю, што адкрыццё пагранперахода не будзе мець заўважальнага адмоўнага ўздзеяння на Белавежскую пушчу. Лічу, што спрычыніцца ён да стварэння новых месцаў работы. Добра было б, каб на працу прымалі мясцовых, — кажа Аляксей Байко з Белавежы. — У мяне ёсць сямейнікі за мяжой. У мінулым прыходзілася ездзіць да іх нават праз Брэст. Зараз будзе магчымасць дабрацца да іх намнога хутчэй.




Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Польскія і беларускія пагранічнікі часова будуць працаваць у кантэйнерах*



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Адкрыццё пагранперахода станоўча ацанілі жыхары Белавежы (злева) Аляксей Байко, Юзэф Камінскі і Павел Бушко*



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*На мерапрыемства прыбылі таксама жыхары прыпушчанскіх мясцовасцей*

— Супраць арганізавання пагранперахода выступалі экалагічныя арганізацыі. Мясцовае насельніцтва станоўча ацэньвае адкрыццё перахода, — заяўляе Павел Бушко. — Раней людзі з Белавежы пераважна працавалі ў лесе. Пасля ўвядзення новай лясной гаспадаркі многія страцілі работу. Некаторыя даязджаюць на працу ў Гайнаўку, а іншыя надалей застаюцца беспрацоўнымі. Можа дзякуючы пераходу ўзнікнуць у нас новыя агратурыстычныя кватэры?

Ваявода Марэк Стшалінскі паінфармаваў, што будова пагранічнай інфраструктуры будзе рэалізавана з прымяненнем экалагічных тэхналогій. На патрэбы пагранперахода перададзена 0,75 гектара зямлі, якой вялікую частку займае дарога. У новаўзведзеных з польскага боку мяжы будынках будуць працаваць польскія і беларускія пагранічнікі, мытнікі і турыстычная абслуга. Мясцовыя жыхары цікавіліся, калі можна будзе пераходзіць мяжу без заграцічнага пашпарта, а толькі з пасведчаннем асобы. Так было раней, калі ў арганізаваных групах наведвалі сваякоў за граніцай або заязджалі на магілы продкаў. На гэтае пытанне польскія чыноўнікі не далі канкрэтнага адказу.

— Нашы сем'і засталіся за мяжой. У мяне там брат і братавая. Раней ездзіла я да іх праз Полаўцы. Зараз можна будзе дабрацца веласіпедам з Белавежы, — гаворыць Ядвіга Лісіцкая.

— Хто захоча займацца гандлем, то паедзе праз Чаромху і Полаўцы. Я думаю, што ў нас будуць ездзіць турысты, — дабаўляе Юзэф Камінскі з Белавежы.

Запрошаныя госці і жыхары навакольных мясцовасцей маглі паглядзець абсталяванне кантэйнераў і паразмаўляць з пагранічнікамі. Беларускія пагранічнікі сказалі мне, што ад граніцы да бліжэйшай вёскі Перароў — тры кіламетры. Да большай мясцовасці Камянюкі, у якой можна ўжо знайсці начлежныя месцы — пятнаццаць кіламетраў. Па дарозе няма яшчэ збудаванай турыстычнай інфраструктуры. Жыхары Грудак ведаюць ужо, што каля іх вёскі будзе стаянка для машын. Ад яе турысты будуць дабірацца да мяжы пяшком або на веласіпедах. Зараз у Белавежы, аддаленай ад мяжы прыблізна на пяць кіламетраў, знаходзіцца пункт пракату веласіпедаў.

У далейшай будучыні за еўрасаюзныя сродкі плануецца арганізаваць турыстычныя шляхі, друкаваць карты і кніжкі з інфармацыяй аб Белавежскай пушчы і наладзіць 8 інфармацыйных пунктаў па абодвух баках граніцы, спалучаных супольнай электроннай сеткай. Палітыкі звярталі ўвагу на большыя магчымасці навуковага супрацоўніцтва паміж польскімі і беларускімі даследчыкамі лясной флоры і фауны.

**Аляксей Мароз**

## Увага — наркотыкі!

Як вынікае з дакументаў бельскай паліцыі, з 2002 года падае колькасць наркатычных злачынстваў у Бельскім павеце: з 123 у 2002 годзе да 48 у 2004; гэты трэнд вельмі выразны. Да таго часу, да 2002 года, было наадварот: колькасць выяўленых злачынстваў патройвалася — у 2001 годзе выяўлена тройчы больш злачынстваў чым у 2000 годзе, а ў 2002 — тройчы больш чым у 2001.

У 2004 годзе толькі адзін малалетак быў абвінавачаны ў здзяйсненні шасці наркатычных злачынстваў; у 2003 годзе восем малалеткаў абвінавацілі ў здзяйсненні 62 такіх злачынстваў. У выніку разведкі ўстаноўлена, што дзеці і моладзь сягалі па найлягчэй даступныя сродкі: удыхаемыя (клеі), марыхуану і амфетамін.

У рамках супрацьдзеяння гэтай з'яве паліцыянты праводзілі з дзецьмі і моладдзю ў школах гутаркі пра згубны ўплыў наркаманії. Бацькоў і настаўнікаў абвучалі пра віды наркотыкаў і спосабы выяўлення пачатковых прызнакаў наркаманії ў дзяцей і моладзі. У мясцовым кабельным тэлевяшчанні выпускаліся папераджальныя перадачы пад лозунгам „Адвядзі час свайму дзіцяці, бо яго зойме дылер". Павятовая камендатура паліцыі супрацоўнічала ў гэтых мерапрыемствах з асветнымі ўстановамі павета. Тройчы ў сярэдніх школах былі праведзены наркатычныя вобыскі з прымяненнем сабак.

Супрацьдзеянне наркаманії з'яўляецца адным з прыярытэтаў дзейнасці бельскай паліцыі. У 2004 годзе было праведзена 20 расследаванняў, у выніку якіх выяўлена здзяйсненне 48 злачынстваў. Наркотыкі завозіліся галоўным чынам з Беластока і Варшавы.

**Міхал Мінцэвіч**

## Нарваўская дэмаграфія

Нарваўская гміна налічвае каля 4,5 тыс. жыхароў. Паўтары тысячы асоб жыве ў Нарве. У 2004 годзе ў Нарваўскай гміне пажаніліся 23 пары. Нарадзілася 27 дзяцей і памерла аж 86 чалавек. Найбольш дзяцей нарадзілася ў Нарве — 10, Крыўцы — 4, у Васьках, Навінах і Трасцянцы — па двое.

Найстарэйшым жыхаром Нарваўскай гміны з'яўляецца 101-гадовы Васіль Трафімюк з Гародчына. На адзін год малодшая ад яго Марыя Астапкевіч (народжаная ў 1905 годзе) жыве ў Макаўцы. Чарговымі доўгажыхарамі з'яўляюцца Анна Алексяюк з Сацоў і Ян Тайгуноў з Трасцянкі, якія нарадзіліся ў 1907 годзе.

У 1910 годзе нарадзіліся Параскева Грыгарук з Гарадзіска, Леакадзія Фэрстэр з Нарвы і Міхал Паўлючук з Трасцянкі ды ў 1909 годзе: Анастасія Кярсноўская з Ласінкі, Параскева Кураш з Гарадзіска, Ян Дударык са Скарышэва і Вольга Андраюк з Сацоў.

**(мох)**

# Вышэйшая школа ў Бельску

**З Пётрам БОЖКАМ, намеснікам старасты Бельскага павета, радным ад Беларускага камітэта, які ўваходзіў у склад Бельскай кааліцыі, размаўляе Аляксей МАРОЗ.**

***— Ужо 2,5 года Вы прымаеце ўдзел у кіраванні Бельскім паветам. Што ў гэтым часе лічыце самым вялікім поспехам?***

— Многа важных спраў рэалізавалася ў гэтым часе ў розных галінах і цяжка было б вылучыць сярод іх самую важную. Гледзячы на патрэбы ўсіх жыхароў, розныя справы можна лічыць паспяховымі. Бельскі павет з'яўляецца інвестыцыйным паветам. На інвестыцыі выдаткоўваецца ў нас каля 5 мільёнаў злотых у год. Большасць інвестыцый праводзіцца з выкарыстаннем еўрасаюзных сродкаў. Самыя вялікія грошы ідуць на мадэрнізацыю дарог. Аднак мы не забываем пра іншыя дзялянкі. Ёсць інвестыцыі ў адукацыі, сацыяльным забеспячэнні, ахове здароўя і іншых галінах.

***— Вы кажаце, што многа сродкаў ідзе на мадэрнізацыю дарог. Ці ўдалося Вам атрымаць дафінансаванне да дарожных інвестыцый з еўрасаюзных сродкаў?***

— Вельмі важная інвестыцыя — мадэрнізацыя вуліцы Міцкевіча ў Бельску-Падляшскім. Перабудова дарогі распачалася ў мінулым годзе, але была спынена. Работы на гэтай вуліцы ўжо вядуцца. Уся мадэрнізацыя будзе каштаваць каля 2,8 млн. зл., але звыш 2 млн. зл. мы атрымаем на перабудову дарогі з еўрасаюзных сродкаў. Мы атрымалі сродкі з Еўрасаюза на мадэрнізацыю дарогі Альшэва — Боцькі размерам 1,2 млн. зл., а ўся гэтая інвестыцыя будзе каштаваць 1,9 млн. зл. Плануем выканаць мадэрнізацыю спартыўнага стадыёна пры Комплексе школ н-р 1. Інвестыцыя гэтая будзе каштаваць 2,6 млн. зл. і на гэтую перабудову таксама выступаем за дафінансаваннем. Выступілі мы таксама за даплатай на іншыя дарогі і чакаем рэзультатаў нашых намаганняў.

***— Раней павятовыя радныя разважалі справу пабудовы кальцавой дарогі вакол Бельска, якая выдатна абмежавала б паток вялікіх грузавых машын у цэнтры горада. Ці ёсць шанцы на рэалізацыю гэтай канцэпцыі?***

— Ужо зараз рыхтуецца канцэпцыя выканання кальцавой дарогі вакол Бельска, якая будзе часткай хуткай дарогі н-р 19. Аднак у гэтым выпадку інвестарам з'яўляецца Управа краёвых дарог. Я думаю, што спачатку будуць мадэрнізавацца краёвыя дарогі, якія ўжо ёсць, а гэтая інвестыцыя будзе рэалізавацца ў далейшай будучыні.

***— Ад нейкага часу ваша староства хадайнічае ў справе стварэння ў Бельску-Падляшскім вышэйшай навучальнай установы. Ці ёсць рэальныя магчымасці, што такая ўстанова пачне працаваць яшчэ з кастрычніка гэтага года?***



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

— Шанцы ёсць, што яшчэ ў гэтым годзе будзе адкрыта ў Бельску-Падляшскім вышэйшая навучальная ўстанова. Кандыдаты ў яе павінны быць, бо зараз у Бельску знаходзіцца 7 сярэдніх школ. Спадзяемся, што прыедуць на вучобу да нас жыхары суседніх паветаў. 21 сакавіка міністр нацыянальнай адукацыі і спорту Міраслаў Савіцкі даў згоду на стварэнне недзяржаўнай вышэйшай прафесійнай школы з названнем „Вышэйшая школа міжнароднага і рэгіянальнага супрацоўніцтва імя Зыгмунта Глогера ў Бельску-Падляшскім". Арганізатарам школы з'яўляецца Грамадскае прэсазнаўчае таварыства „Стопка" з Ломжы.

***— На якія спецыяльнасці могуць разлічваць выпускнікі сярэдніх школ?***

— У школе будуць два аддзяленні: філалогія і эканомія. У рамках філалогіі будуць тры спецыяльнасці: англійская, нямецкая і расійская філалогіі. Казначэйства і фінансавая палітыка ды міжнароднае і рэгіянальнае супрацоўніцтва будуць спецыяльнасцямі ў рамках эканоміі. Пасля вучобы ў бельскай школе студэнты з вышэйшай прафесійнай адукацыяй змогуць працаўжаць вучобу на іншых ВНУ на атрыманне звання магістра.

***— Дзе будзе знаходзіцца вышэйшая навучальная ўстанова?***

— Будзе яна распалажана ў Комплексе прафесійных школ н-р 2, які знаходзіцца па вуліцы Войска Польскага.

***— Ці беларусы з Рэспублікі Беларусь могуць разлічваць на фінансавую дапамогу, калі рашацца прыехаць на вучобу ў Бельск?***

— Дапамога студэнтам будзе разглядацца ў індывідуальным парадку. Ужо ідэя стварэння школы прадбачвае, што ў нашай вышэйшай установе змогуць вучыцца студэнты з суседніх дзяржаў. Што тычыцца Беларусі, то там памяняліся прынцыпы выезду на вучобу за мяжу. Зараз кожны беларускі студэнт, які захоча вучыцца ў іншай дзяржаве, будзе вымушаны атрымаць на гэта згоду. Мы маем надзею, што гэта не абмяжуе прыезду студэнтаў з Беларусі ў Бельск.

***— Ці падрыхтаваныя ўжо месцы ў інтэрнатах для студэнтаў?***

— Многа свабодных месц маецца ў вучнёўскай бурсе, распаложанай па вуліцы Відаўскай і там будуць пасяляцца студэнты.

***— Выкладчыкі з Беларусі працуюць на Універсітэце ў Беластоку. Ці прадбачваюцца ў Бельску навуковыя работнікі з Рэспублікі Беларусь?***

— Ёсць планы, што будуць працаваць выкладчыкі з Беларусі і ёсць у нас надзея, што яны атрымаюць згоду на працу за мяжой.

***— Вялікую частку жыхароў Бельскага павета састаўляюць беларусы. На якую падтрымку ў галіне развіцця беларускай культуры і асветы маглі разлічваць жыхары павета ў апошні час?***

— Бельскае староства фінансуе II Агульнаадукацыйны ліцэй з беларускай мовай навучання ў Бельску-Падляшскім. Я ганаруся тым, што ў 1988 годзе закончыў гэты белліцэй, бо паводле рэйтынгаў — ён адзін з найлепшых у Падляшскім ваяводстве і адзін з лепшых у нашай краіне. Калі гаварыць аб падтрымцы беларускай культуры на Бельшчыне, то патрэбы ёсць большыя, чым наша дапамога. Аднак мы стараемся супрацоўнічаць з Дарафеем Фіёнікам і яго Музеем малой айчыны. Успамагаем дзейнасць Брацтва праваслаўнай моладзі з Бельска. Фінансава падтрымлівалі мы арганізацыю „Спасаўскіх запустаў", „Агляду беларускай песні", ці „Паэтычнага трохгалосся". Яшчэ з вясны мінулага года намагаемся наладзіць супрацоўніцтва з нейкім раёнам у Беларусі. Гаварылі мы ў гэтай справе з паслом Беларусі і генеральным консулам Рэспублікі Беларусь. У Генконсульства мы перадалі ліст з просьбай дапамагчы нам знайсці партнёра. Мінуў ужо год і не знайшліся ахвотныя на супрацоўніцтва з Бельшчынай. Затое наладзілі мы супрацоўніцтва з латвійскім паветам.

***— Вы з'яўляецеся старшынёй арганізацыйнага камітэта VI з'езда выпускнікоў Бельскага белліцэя, які будзе праходзіць з 23 па 25 верасня гэтага года. Ці разлічваеце на масавае мерапрыемства?***

— Зацікаўленне ёсць вялікае. Выпускнікі хочуць спаткацца, паразмаўляць аб мінулым. Гэта будзе сентыментальнае падарожжа ў мінулае. Плануем арганізаваць мерапрыемства прыблізна на 500 асоб. Свой прыезд пацвердзілі ўжо выпускнікі, якія зараз жывуць у розных краінах Еўропы і Злучаных Штатах Амерыкі.

***— Дзякую за размову.***

# Як я ехаў з Беластока ў Слонім

У Беласток беларусаў цяпер стала ездзіць менш і менш. Нявыгадна. Але людзі, асабліва з Гарадзеншчыны і Берасцейшчыны, сяды-тады і выбіраюцца па тавар. І хоць праз беларускую мытню цяпер шмат чаго не правязеш, бо праводзіць тавараў абмежаваны, беларусы ўсё ж умудраюцца вярнуцца дамоў з таварам больш якасным, смачнейшым і таннейшым. Галоўнае — праехаць беларускую мытню, а польскія мытнікі асабліва не глядзяць, што ты вязеш з краіны Еўрапейскага Саюза. А вось беларускія мытнікі ўсюды любяць сунуць свой нос. Не дай Бог у тваім багажы будзе больш 5-ці кілаграмаў польскіх мясных вырабаў, ці электратавары, ці будаўнічыя матэрыялы — будуць праблемы і прыйдзецца плаціць вялікі падатак.

Па сваіх літаратурных справах у мінулыя выхадныя дні наведаў Беласток і я. Вяртаючыся дамоў прыхапіў з сабою беларускі тыднёвік „Ніва", што выходзіць у Беластоку і некалькі беларускіх кніжак. Закінуўшы сумку на плячо, падаўся на Юравецкі рынак, адкуль лёгка можна заехаць у Гародню, Ваўкавыск, Слонім.

У гэты дзень марусіў дождж і легкавушак з беларускімі нумарамі каля рынку было нямнога. Але шукаць машыну, якая едзе ўбок Баброўнікаў, доўга не прыйшлося. Жанчына, якая прадавала цыгарэты, паабяцала нас на сваёй машыне дакінуць да Ваўкавыска. Нас — гэта мяне і студэнта Мінскай духоўнай акадэміі ў Жыровічах. Ён вяртаўся пасля выхаднога уік-энда ад сваіх бацькоў з Гайнаўкі.

Па дарозе вадзіцель заехаў у адзін з прыватных дамоў Беластока, пакінуў там пустыя каністры, гарэлку і блокі цыгарэт, якія не паспеў ён з жонкаю рэалізаваць. А пасля мы рушылі да польска-беларускай мяжы. Праз гадзіну наш аўтамабіль ужо стаяў на самай мытні. Прайшоўшы лёгка польскіх мытнікаў, так прайсці лёгка беларускіх не ўдалося. Нечым незадаволены беларускі мытнік папрасіў адкрыць багажнік аўтамабіля і адразу звярнуў увагу на маю вялікую, але амаль пустую сумку.

— Что в сумцы? — запытаўся мытнік.

— Нічога сакрэтнага і небяспечнага няма, — адказваю.

— А это что за газеты? — убачыўшы некалькі нумароў беластоцкага беларускага тыднёвіка „Ніва", запытаўся мытнік.

— Гэта беларуская „Ніва", якая выходзіць у Беластоку, — тлумачу мытніку.

— Зачэм везете? Для распрастранения?! — дапытваецца службовец.

— Для «распростронения» вязуць шмат і аднолькавых нумароў, а гэта розныя нумары і іх усяго некалькі, — тлумачу дасціпнаму.

Больш пытанняў мытнік не задаваў, ён доўга яшчэ гартаў газеты і спыніўся чамусьці на артыкуле Лены Глагоўскай „Браніслаў Эпімах-Шыпіла". Чалавек доўга ўглядаўся ў здымак слыннага дзеяча беларускай культуры, які жыў у XIX-XX стагоддзях, і па яго́ным твары было бачна, што ён не можа ўспомніць: хто ж гэта на здымку — ці Пазьняк, ці Шарэцкі, ці Сорас, ці яшчэ нехта з гэтых праклятых „дэмакра-




таў-шпіёнаў". А пра Эпімах-Шыпілу ні ён, ні яго ўнукі і ні праправраўнукі і блізка відаць не чулі. Але нарэшце ўпэўніўшыся, што гэта не той таварыш, які яму трэба, мытнік пакінуў усіх у спакоі і мы паехалі.

Вадзіцель нас завёз на вакзал у Ваўкавыск, які сустрэў чысцінёй і шматлюднасцю. Найбольш было студэнтаў, якія ад'язджалі на вучобу пасля выхадных дзён. Чыгуначны вакзал і аўтастанцыя ў Ваўкавыску пасля „Дажынак" сапраўды ўражваюць сваёй сучаснасцю і культурнасцю. І што цікава, дык гэта тое, што чыгуначны вакзал афармлены па-беларуску, а вось аўтастанцыя па-расійску. Хаця яны знаходзяцца побач і аддзяляе іх адзін ад аднаго платная прыбіральня. Мясцовыя чыноўнікі магчыма думаюць, што з расійскамоўнай аўтастанцыі жыхары Ваўкавышчыны ездзяць у Волагду ці ў Мыцішчы, а не ў Воўпу і ў Рось. Ці можа гэта і ёсць тое двухмоўе, якое нібыта павінна існаваць пасля небязвыдомага рэферэндуму.

Праз гадзіну на перон прыехаў „дызель" і мы з семінарыстам спакойна селі ў вагон і рушылі на Слонім. Юнак расказаў пра вучобу ў Мінскай духоўнай акадэміі, пра тое, што ён закончыў яшчэ духоўную семінарыю ў Варшаве і што марыць вучыцца далей.

Але нашу гутарку хутка парушыла песня. Маладыя сімпатычныя хлопцы пад гітару пачалі спяваць рускую папсу. Спявалі прыгожа, гучна, хораша. Побач спала п'яная жанчына. Пачуўшы песні яна прачнулася і стала пасярод вагона пад музыку таньчыць. Пасажыры заўсміхаліся. А адзін з „артыстаў" (дарэчы ўсе юнакі былі цвярозыя) — высокі светлы хлопец пусціўся з п'янаю кабетаю ў скокі. Ад убачанага вагон зарагатаў. А дзяўчаты ў здзіўлені закрычалі: „Жэня, ты што робіш?!". А Жэня смяяўся і скакаў. Праз некалькі хвілін песня скончылася, скокі таксама. П'яная кабета ўпала на сядзенне, а Жэня з хлопцамі працягваў спяваць усё новыя і новыя песні з сучаснай рускай папсы.

Пад'язджаючы да Слоніма „артысты", перабраўшы ўвесь папсоўскі рэпертуар, заспявалі: „Офицеры! Россияне! Пусть свобода вам сияет!..". Вагон ад гэтай песні прыціх. Да юнаком падышоў мужчына сярэдніх гадоў і папрасіў, каб такіх песень больш не спявалі, а спявалі пра беларускіх афіцэраў. На гэтым канцэрт у вагоне скончыўся.

„Дызель" пад'язджаў на слонімскі перон. Усе маладыя спевакі падрыхтаваліся да выхаду. А Жэня не супакойваўся. У п'янай жанчыны ён спытаўся: „Куды едзеш?" — „У Баранавічы", — адказала кабета. „Выходзь у Слоніме, пажэнімся!" — жартаваў юнак. Баба схапіла нейкую торбу і пачала лупасіць Жэню і ўсіх папарадку. Са смехам пасажыры выскоквалі з вагона на чысты слонімскі перон...

Праз хвіліну цягнік паехаў далей на ўсход — на Баранавічы.

Сяргей Чыгрын

## Пакражы самаходаў

Крадзяжы самаходаў на Бельшчыне набралі трывожнага размаху ў 1990-х гадах. У 1994 годзе прапалі 4 самаходы, у 1995 — 9, у 1996 — 14, у 1997 — 39. У 1998 годзе было зафіксавана аж 50 пакражаў аўтамабіляў, з гэтага ліку ўдалося знайсці 24 на тэрыторыі Бельскага павета і 17 у іншых мясцовасцях, м.інш. у Варшаве, Беластоку, Гайнаўцы і Вышкаве. Бельскай паліцыі ўдалося тады ўстанавіць 28 віноўнікаў, з ліку якіх 12 былі арыштаваны. На тэрыторыі павета дзейнічалі дзве злачынныя групы: адна з-пад Варшавы, якая спецыялізавалася ў пакражах „Паланезаў" і другая з наваколля Высока-Мазавецка і Браньска, якая крала „Фіаты-126р". Праведзеныя тады паліцыйныя дзеянні абмежавалі колькасць гэтых злачынстваў. У 2000 годзе ўкралі 24 самаходы, з ліку якіх удалося вярнуць з тэрыторыі павета 10 самаходаў і 8 аўтамашын звонку. Чарговыя, 2001-2003 гады зладзеі абмінаюць Бельшчыну дзякуючы паліцэйскім акцыям супраць гангаў аўтамабільных зладзеяў у Валоміне, Мышкаве, Дамброўцы, Беластоку і Цеханаве. Але ўжо ў мінулым, 2004 годзе, у Бельскім павеце прапаў 21 самаход, і толькі адно злачынства было раскрыта.

Міхал Мінцэвіч

## Хто добры?

Прачытаўшы заметку „Брэжнеў з Крамля" („Ніва" № 12) прыйшло мне ў галаву, што аўтар меў на думцы некага іншага, але пабаяўся сказаць гэта адкрытым тэкстам. Галоўны рэдактар штотыднёвіка „Не" не пабаяўся і за падобную публікацыю атрымаў 20 тысяч злотых штрафу. Калі прэзідэнт Расіі загневаецца з гэтае прычыны, то можа ніўскага карэспандэнта падаць у суд.

Апошнім часам у сродках масавай інфармацыі разгарэлася вайна паміж Валэнсам і Радыё Марыя. Калі дойдзе да суда, то прысуд залежаць будзе ад таго, чым прыхільнікам акажацца суддзя. У Гіжыцку Валэнсу сустрэла варожая дэманстрацыя, кідалі ў яго снежкамі. Былому прэзідэнту гэта моцна забалела. А як у Вроцлаве Ярузельскі дастаў каменем па галаве, то пра гэта — маўчок. Калі нас б'юць — кепска, калі мы б'ем — добра!

Дзядзька Захар

**Папраўка**

*У 15 н-ры „Нівы" ад 10 красавіка 2005 г. у тэксце „Мой радавод" дапушчаны памылкі. Было напісана: „Быў адзіным сынам з другога сужонства ад Рамана Маркевіча і Марыі з роду Рачкевічаў". **Павінна быць: „Ад Рамана Сідарука".** Далей было напісана: „Дамоў вярталіся разам з іншымі, без жонкі і дзяцей — Андрэя і Мішкі, старэйшага ягонага сына". **Павінна быць: „без жонкі дзядзечкі Андрэя і Мішкі, старэйшага ягонага сына".***

# Залаты інтарэс крэсавякаў

Міша Качан пражываў у адным з беластоцкіх інтэрнатаў у пакоі разам з Міркам і Вовам. Як сукватарант вёў сябе лідэрам, адчуваў нованароджаным палякам у сваёй новай айчыне. Сам ён родам з правінцыйнага мястэчка на Беларусі, у якім было шмат качалак у блёкавых падвалах, у якіх малалетнія жулікі выцiскалі па сто кілаграмаў, прычым усталёўвалі будучыя кантакты. Такім чынам Качан пазнаў Альфонса Зонга. Альфонс не выглядаў ніколі на такога, які качаў вялікі груз, бо яму гэта непатрэбнае. Ён выцiскаў галавою. Сам быў упэўнены, што яго дзед быў паклоннікам змагароў за незалежнасць, а бабуля спявала польскія патрыятычныя песні. Ён, так як і Качан, апынуўся ў Польшчы фуксам.

Зонг быў шалапутам, які прыдурваўся блазнам перад сябрамі Качана, хаця быў яму босам. Альфонс жыў у інтэрнаце дагэтуль, пакуль яго бацька не выкупіў кватэру ў новым раёне горада. Аддаў тады яму таксама старое, чорнае „БМВ", на якім кожны уік-энд перасякаў ён мяжу. Там ведаў яго кожны пагранічнік, які смела ківаў сваёй шэльмоўскай мордай, каб прапусціць Зонгу па-за чаргою кантрабандыстаў на другі бок мяжы. Там чакалі яго землякі з таварам у спіртавозе. Зонг лічыў пакеты цыгарэтаў ды бутэлькі з савецкай баўтухай, што прывозілі на мяжу цыцатыя бабы, пасля ляпаў па-сяброўску па плячу кожнага пацанчыка. Так развітаўшыся, імчаў на сваім чорным „БМВ" у Беласток.

У інтэрнаце чакаў яго збянтэжаны ды нявыспаны з-за начной варты Качан. Ну і нёс наш Альфонсік цэлую сумку загружаную вельмі ходкім у інтэрнаце таварам. Перад тым мінаўся з кіраўніцай інтэрната, якая кланялася нізка ў пояс. Ён добра ведаў з кім можна падзяліцца сваімі поспехамі. Зайшоўшы ў пакой, страшэнна засопся, бо ж цяжкія бутэлькі з метылавым алкаголем. У той час Качану мінула злосць. На від тавару ён па-сяброўску ляпае па плячы чаканага кантрабандыста і любуецца змесцівам яго агромністай торбы. Качан дастае з шафы некалькі соцень зялёных баксаў, на від якіх Альфонс аж падскочыў ад радасці. „Хай сабе марнуюць здароўе дурныя студэнты, хай выбіваюць уначы дзверы, не даюць спаць, але найважнейшае, што бізнес квітнее", — падумаў. Дзяўчына Качана таксама ажывілася і не вочы загарэліся шчасцем, мабыць, сёння паедуць у „Лідэр-Маркет" і добра пагуляюць. Стала яна застаўляць стол прысмакамі і запрашаць Качана і Зонга за стол. Іх нічога не абыходзіла, што п'яныя студэнты не даюць спакою іх сукватарантам. Што там тыя смаркачы ведаюць як цяжка зарабляць грошы, калі яны самі просяць пачку сініх або бутэльку з рускай баўтухай. Найважнейшае, што бізнес круціцца. Хто ведае колькі ў Беластоку такіх студэнцкіх крэсавых кантрабандыстаў.

Сяргей Чарнышын

**Аб'явы**

*Dymka, producent, tel. (022) 785 22 53.*


Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

# „Роднае слова 2005”


Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Міхась Хмялеўскі — Беласток


Уршуля Баравік — Дубічы-Царкоўныя


Магдаліна Кубай — Бельск-Падляшскі


Матэвуш Магрук — Бельск-Падляшскі

## Салавейка маленькі

Па латыні ён — *luscina luscina*, птушка сям'і драздовых, атрада вераб'інападобных. Пташка невялічкая, якая асацыюецца з вясной, каханнем, маладосцю, тугой... I блізкі ён птах нашых прабабуль ды прадзядуль, і ўсяго славянскага роду з ягонымі спеўнымі мовамі. Пра салаўя, які цешыць нас спевам, і мы наспявалі шмат песень — больш тужлівых, сумных, чым вясёлых, аб радасці вясноўага аднаўлення.

Салавейка маленькі — важыць да 30 грамаў, даўжыні да 17,5 см. Апярэнне спіны аліўкава-бурае, брушка белаватае, бакі буравата-шэрыя. На валляку стракатая, шэравата-вохрыстая пляма. Хвосцік рыжаваты. Прылятае ў канцы красавіка-пачатку мая і праз 3-5 дзён пачынае спяваць. Спявае амаль усю ноч, у разгар шлюбнага перыяду (да паловы чэрвеня) таксама і ўдзень. Песня — поўная шчоўкання, пераліваў, пяшчотныя гукі змяняюцца гучнымі, вясёлыя — журботнымі. У найлепшых спевакоў песня налічвае да 12 „кален”. У час спеваў гэтая асцярожная птушка губляе ўвагу і дазваляе падысці да сябе. Здольны да імітацыі галасоў жывёл. Гняздо ўе звычайна на зямлі, паміж каранямі кустоў, радзей каля спляценняў галін каля зямлі, з сухога лісця, тонкіх галінак, сцяблоў травы, лісця асакі, добра яго маскіруе, высцілае травой, тонкімі карэньчыкамі, зрэдку трапляецца конскі волас.

Яйкі салавей складвае ў канцы мая — на пачатку чэрвеня, па 4-6 аліўкавых, карычнева-аліўкавых альбо цёмна-шакаладных, наседжвае да 14 дзён. Салавяняты пакідаюць гняздо за менш чым два тыдні. Да верасня трымаюцца выводкамі, вандруюць. Адлятаюць у верасні.

Селіцца салавей звычайна ў хмызняках на берагах вадаёмаў, ускрайках вільготных лясоў, на лугах, у гаях, садах і парках, паблізу вады. Корміцца жукамі, клапамі, вусенямі, мнаганожкамі, мухамі, павукамі і іншымі насякомымі, восенню — ягадамі і насеннем.

Я жыву ў цэнтры Беластока, у раёне Тысячагоддзя, адным з найстарэйшых раёнаў горада. Недалёка маёй вуліцы Вясёлай — парк, Звярынецкі лес. Але салаўі ўпадабалі якраз невялічкія скверыкі паміж дамамі, абсаджаныя кустамі і немаладымі дрэвамі. I пяюць-заліваюцца, адзін перад адным усхваляючы сваё каханне і месца, куды давялося ім вярнуцца з трапічнай Афрыкі, куды ляталі перазімаваць. Значыць, добра ім тут жыць ды выводзіць дзетак. А і мы рады іх спевам, хоць, сапраўды, бывае, што не заснеш усю ноч!..

**Міра Лукша**

## Вершы Віктара Шведа

### Вайна з прагнасцю

*— Што ты робіш, Маргарыта,*
*Перад лядоўнікам адкрытым?*
*— Мне прыглядацца так цудоўна,*
*Калі яды ўсялякай поўна.*

*— Марнуеш, доня, яду гэту,*
*Калі ў лядоўніку ўжо лета.*
*Матулі дочанька талкуе:*
*— Я, мама, з прагнасцю ваюю.*

## Польска-беларуская крыжаванка № 17

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.




Адказ на крыжаванку н-р 13: Жанр, ганец, узор, буслянка, вяртанне, на, бутля, тры, як, рак, сын, ты, расклад. Жаба, бант, святар, руля, ар, зярнятка, гонта, арка, дыск, анёл, яна, цукерак.

Узнагароды, аўтаручкі, выйгралі: Эля Шарэйка, Бася Хіліманюк, Дарота Цімашук, Рафал Тамашук, Паўліна Мялешка з Дубін, Івона Баршчэўская з Пашкоўшчыны. Віншуем!

# Далоў дзеравянае акцёрства!

Яшчэ сёння ў маіх вушах гучаць выступленні апошняга „Роднага слова” ў Нараўцы. І — цікава. Памятаюцца толькі характэрныя выступленні: тыя цудоўныя, ды тыя дзівосныя, са штучным і нездаровым пафасам.

Вось некалькі парад дэкламатару:

Найчасцей паўтараеш сяброў — звычайна тых старэйшых, з вопытам ды славай. Гэта нармальная з’ява. Аднак адзін паўтор мае „кароткія ногі”. Каб вытрымаць у „прафесіі” — трэба ўвесь час удасканальвацца. Як? Чытаць вершы. Шукаць аўтараў, якія табе падабаюцца. Трэба думаць, якое дачыненне мае твой верш да цябе самога. Ці ён сугучны тваім думкам і адчуванню. Як гэта зрабіць? Проста. Калі рыхтуеш верш пра маці — падумай, што ён пра тваю маму, калі пра ката — думай пра свайго коціка (або сабаку), калі пра айчыну — падумай ці ўвогуле пра яе думаеш! Якраз пры гэтай тэме найбольш штучнага стылю, які спецыялісты насмешліва называюць дзеравяным акцёрствам. Сцеражыся яго, інакш станешся героем школьных анекдотаў!



Уля Скепка — Бельск-Падляшскі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Думаю, каб выступаць на сцэне, трэба любіць вершы. Таму, калі чую як наракаеш, што атрымаў „слабую” ўзнагароду і маеш на ўвазе беларускую кніжку — мне смешна.

Ужо сам факт, што прадстаўляеш свой клас і школу — вялікі гонар і ўзнагарода. Пра ўзнагароды не думай, калі ты сапраўды штосьці варты — узнагароды прыйдуць самі! Можа ў лепшы час, калі іх адпаведна ацэніш...

Як мы сказалі, найважнейшае мастацкае захапленне — момант, з якога пачынаецца мастацкае развіццё. Сёння напішу пра выступленні дзяцей і моладзі, якія мне спадабаліся. Думаю, што нягледзячы на месцы і ўзнагароды яны павінны развіваць свае здольнасці.

Сярод наймалодшых зноў адметна выступіла **Магдаліна Бабік**. У Магдаліны адчуванне слова і сцэны, відавочная харызма. Магда мае шчасце, што ў яе таленавітая мама: спявачка, настаўніца музыкі і танца. Таксама, калі ідзе пра веданне беларускай мовы, цяжка знайсці лепшы ўзор.

Сяброўка Магды — **Юстына Апольская** мае вялікія здольнасці і магчымасці, але не хапае ёй узору. Паўтараць агульнавядомае ёй — мала! Дзяўчынцы пакуль дапамагае файная выпадковасць. Напэўна многія з вас памятаюць яе паклон публіцы ў мінулым годзе.

У катэгорыі I-III класаў асабліва ўразілі мяне тры выступленні. Першая зорачка — гэта **Магдаліна Кубай** (дэкламавала верш У. Аўласенькі „Носік-курносік”). На поспех Магдаліны запрацавала падборка верша (у яе таксама носік-курносік). Тут жа выявіліся яе сцэнічныя і моўныя здольнасці. **Марта Зінкевіч** у сваю чаргу захапіла дзіцячай шчырасцю, сімпатычнасцю і культурай слова (дэкламавала верш А. Матуціс „Цяпер і заўтра”). У іншым стылі выступіла **Эля Зайко**, яе дэкламацыя (верш С. Шушкевіча „Колькі кіпцікаў у кошкі”) вылучаўся ўражлівасцю ды цікавасцю да зместу верша.

Цікава-ласкавае выступленне атрымалася ў **Улі Баравік** ды **Іаанны Марчук**. Апошняя дэкламатарка вылучалася культурай слова. Ася падрыхтавала верш Л. Пранчака „Баравік”.

У катэгорыі IV-VI класаў было яшчэ больш класных выступленняў.



Эдыта Наўроцкая — Дубічы-Царкоўныя

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Напачатак скажам пра гаспадароў з Нараўкі. Самым сімпатычным і дапрацаваным выступленнем лічу дэкламацыю **Якуба Сухадолы** (верш М. Капыловіч „Дзіравая памяць”). Напэўна сцэнічнымі і дэкламатарскімі здольнасцямі валодае **Эдыта Наўроцкая**. Дзяўчынка, аднак, павінна больш углыбіцца ў сэнс твора, асабліва перадумаць эмоцыі, каб не перабольшыць справы. **Павел Варановіч** і яго сястра **Паўліна Варановіч** — маюць акцёрства ў крыві! Іх не толькі прыемна слухаць, але і любавацца як ажываюць і чаруюць на сцэне.



Наталля Семянюк — Чыжы

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Таксама чаруюць сёстры **Эля і Ася Коршак** — іх стыль закрашаны жартаўлівай, лёгкай іроніяй. Спадабаліся мне выступленні **Наталькі Лаўранюк, Іаанны Насковіч, Агнешкі Рэпнік, Марлены Леанюк.** Дзяўчаты ад гадоў не выпадаюць „з прафесіі”, хоць цяжка сказаць, што бойка ідуць уперад!



Наталля Лаўранюк — Бельск-Падляшскі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Пра беластоцкія зоркі дэкламацыі я пісала пры нагодзе іх раённага агляду. Гэта адносіцца да дзяцей як і гімназістаў. Менавіта, самай самавітай групай у Нараўцы былі сёлета гімназісты!

Наколькі ў малодшых катэгорыях былі яшчэ хлопцы, тут пераважалі дзяўчаты. Запамяталася мне **Аліцыя Міранчук**, якая на мінскасталічнай беларушчыне распавяла быль М. Шаховіча „Гагатуха” пра наш навагодні абрад. Аліцыя выступіла як першая пасля перапынку, аднак удалося ёй суцішыць залу. **Марыёля Герман** падабрала малавядомы твор А. Гарэй „Бірута”. Гістарычная паэма пра каханне вельмі падыходзіла да выканаўцы, дарэчы, прыгожай і чароўнай як легендарная балцкая княгіня.

Цікавая (і сугучная прыпушчанскаму краявіду і духу) падборка атрымалася ў **Марты Насковіч**, якая дэкламавала верш Алеся Барскага „На далонях тваіх”. Цяпер, увага! Я пад уражаннем прэзентацыі **Аляксандры Лаўранюк**. Оля паказала як пазбегчы штучнага пафасу пры дэкламацыі патрыятычных твораў. Хоць гаварыла пад „баявітую і гордую камсамолку”, ва ўсім адчувалася дыстанцыя, добрая акцёрская крэацыя. Яе дэкламацыя падыходзіла б да музычнага альбома „Я нарадзіўся тут” — (верш В. Вабішэвіч „Ты што, выраксся нашай радзімы!”). Падобны прыклад прадставіла **Наталька Швед**, якая з адчуваннем дэкламавала верш А. Вярцінскага „Баіцца быць беларус беларусам”.

**Эдыта Перавой**, у сваю чаргу, не пабаялася філасофскага твора. Думаю, што спелае і прадуманае выступленне спадабалася б аўтарцы твора — Надзеі Артымовіч („Свет укінуты ў бельскую казку”). Эдыта чутка адлюстравала неспакой лірычнага героя.

На пытанне — якое выступленне лічу найбольш файным — скажу без сумнення — гэта **Міхась Хмялеўскі** з Беластока (верш В. Іпатавай „У Рыгора сёння гора”). Думаю, што не толькі мне — Міхась атрымаў найгучнейшыя воплескі.

Прозвішчы ўсіх лаўрэатаў, якіх вылучыла камісія, друкуем побач.

**Зорка**

## *Найлепшыя дэкламатары*

*Больш за палову дэкламатараў цэнтральнага этапу (на 104 асобы — 62) сталі лаўрэатамі і атрымалі вылучэнні. Камісія ў саставе Тамара Русачык (старшыня), Яніна Плютовіч і Янка Карчэўскі ацаніла ўдзельнікаў у чатырох катэгорыях і назначыла сярод іх 20 вылучэнняў, 16 трэціх месц, 11 — другіх, 12 — першых.*

*Тры ўзнагароды Гран-пры — атрымалі: Магдаліна Кубай, Наталля Лаўранюк, Юліянна Дораш (усе з ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім).*

*Вось прозвішчы лаўрэатаў:*

*У катэгорыі нулявых класаў:*

*I месца — Магдаліна Бабік з Садка н-р 14 у Беластоку, Магдаліна Маліш з Орлі,*

*II месца — Юстына Апольская з Садка н-р 14 у Беластоку,*

*III месца — Дар’я Маліш з Орлі.*

*У катэгорыі I-III класаў:*

*I месца — Уршуля Скепка з ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім, Ніна Ваўранюк з ПШ н-р 4 у Беластоку, Уршуля Баравік з ПШ у Дубічах-Царкоўных,*

*II месца — Дзмітры Кандрацюк з Варшавы, Лідзія Пякарская з ПШ н-р 4 у Беластоку, Канстанцыя Дораш з ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім,*

*III месца — Наталля Семянюк з Чыжоў, Наталля Карпюк з Орлі, Павел Асіпюк з Нарвы, Івона Максімюк з Рыбалаў.*

*У катэгорыі IV-VI класаў:*

*I месца — Матэвуш Сэвастыянік з ПШ н-р 4 у Беластоку, Наталля Андраюк з Кленік, Наталля Кандрацюк-Свярубская з ПШ н-р 4 з Беластока,*

*II месца — Павел Варановіч з Бабік, Аляксандра Каліна з ПШ н-р 4 у Беластоку, Іаанна Насковіч з Бельска-Падляшскага,*

*III месца — Крыстына Свідэрская з Кляшчэль, Іаанна Коршак з Храбалоў, Юстына Давідзюк з Рыбалаў, Матэвуш Магрук з ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім.*

*У катэгорыі — гімназіі:*

*I месца — Кацярына Кузьміч з Гарадка, Наталля Швед з Беластока, Паўліна Глінка і Аляксандра Лаўранюк з Бельска-Падляшскага,*

*II месца — Эдыта Русіновіч з Орлі, Марыёля Герман з Гайнаўкі, Анна Янчук з белгімназіі ў Гайнаўцы, Альжбета Юшчук з Беластока,*

*III месца — Міхась Хмялеўскі і Міхась Каліна з Беластока, Ева Кудэрская, Анна Кандрацюк і Рафал Валасэвіч з Бельска-Падляшскага.*

# Не думаў, што ёсць такая прафесія...

**Інтэрв’ю з заслужаным артыстам РБ Віктарам МАНАЕВЫМ**

**Віктар Манаеў нарадзіўся ў Мінску. Закончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут у 1980 г. Адразу пасля заканчэння інстытута стаў працаваць у Нацыянальным тэатры імя Янкі Купалы. Яго самыя вядомыя ролі: Кай („Снежная каралева” Х. К. Андэрсена), Лёнька Адуванчык (А. Дудараў), Мікіта Зносак („Тутэйшыя” Я. Купалы), Мікіта („Ажаніцца не журыцца” Далецкіх і М. Чарота), Ян Губач („Ідылія” Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча), Фядотык („Тры сястры” А. Чэхава). Іграў у многіх фільмах, лаўрэат прэміі СССР (1985), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1992), узнагароджаны дыпломам за лепшую ролю на фестывалі „Прыбалтыйская тэатральная вясна — 85”, выдатны акцёр, майстар, духоўны мастак...**



*— Спадар Віктар, як атрымалася, што Вы звязалі сваё жыццё менавіта з тэатрам, што, паводле Вас, значыць „любоў да тэатра”?*

— Гэта ж ад Бога ўсё дадзена — каму чым займацца.

*— Як гэта ў Вас аб’явілася?*

— Дзякуючы школьнаму бібліятэкару ў трэцім класе я пачаў хадзіць на драматычны гурток. Бібліятэкарка была незвычайнай жанчынай закаханай у тэатры, заснавальніцай драматычнага гуртка. Яна і мяне туды запрасіла. Калі я пазычыў у бібліятэцы многа кніжак, яна вырашыла праверыць, ці я іх чытаю. Паказала на кніжку „Цветик-семицветик” і загадала расказаць змест. Казку я расказаў так, што яна смяялася, хаця казка была і не зусім смешная. Гэты расказ адчыніў мне дарогу ў драматычны гурток. Добра памятаю і сваю прэм’еру. Я іграў ролю кухара Пельмеля ў спектаклі пра інтэрпункцыю. Калі я выйшаў на сцэну з выпханай падушкай замест жывата, усе смяяліся і рагаталі. Я тады падумаў: „Які я шчаслівы, што ім цяпер добра”! Я хацеў стаць акцёрам, але ў інстытут мяне не прынялі. Мой лёс звязаў мяне з лялечным тэатрам. Спачатку перажываў, што я — не драматычны акцёр, але пасля сам захацеў працаваць з лялькамі. Усё ж такі склалася, што ўжо ў нацыянальным тэатры я памаленьку пачаў выступаць і ў іншых жанрах.

*— Калі Вы былі маленькім хлопцам, думалі калісьці пра працу ў тэатры?*

— Не, не думаў. Я ўвогуле не думаў, што ёсць такая прафесія, а толькі думаў, што людзі прыходзяць пасля работы і іграюць.

*— Пра што павінен памятаць акцёр, якія асноўныя правілы (апрача таленту) працы ў тэатры?*

— Самае галоўнае для акцёра — захаваць цвярозы розум, заўсёды крытычна ставіцца да сябе.

*— Вы вядомы яшчэ як кінаакцёр. Якая роля ў кіно была Вам найдаражэйшая?*

— Гэта была, напэўна, кароткая, толькі 3-хвілінная роля ў фільме „Ідзі і глядзі”, якога рэжысёрам быў Элем Клімаў. Я там іграў ролю салдата, які павінен зрабіць фатаграфію партызанскага атрада перад бітвай. Партызан трэба было развесяліць, каб падняць іх баявы дух. І я весяліў...

*— Вы іграеце на сцэне Нацыянальнага тэатра імя Янкі Купалы. Вядома, што спектаклі ідуць на беларускай мове. Як выглядаюць Вашыя адносіны да мовы і адносіны вашых калегаў-акцёраў?*

— Акцёры гэта частка таго грамадства, у якім мы жывём, яны не іншыя людзі з іншай планеты. Яны — частка нашага жыцця. Добра, што тут працуюць артысты, якія дасканала валодаюць беларускай мовай. Бывала ў нашым тэатры, што былі праблемы з беларускай мовай, прыходзілася дасканаліць мову не толькі тым артыстам, якія прыехалі з Расіі, тут працуюць і жывуць, але і нам, беларусам. Так гістарычна склалася, што беларуская мова на Беларусі вынішчалася. У 60-х гадах Хрушчоў сказаў, што Беларусь будзе першай савецкай рэспублікай. Менавіта савецкай — не рускай ці беларускай. Вялася сур’ёзная барацьба з беларускай мовай.

*— Як выглядаюць унутраныя сувязі і адносіны паміж акцёрамі? Вы сябруеце ці адносіны па працы складаюцца паводле схемы: прыйшоў, зайграў, пайшоў?*

— Наш тэатр унікальны. Я не ведаю, ці ёсць яшчэ ў Беларусі тэатр, дзе акцёры гэта сапраўдная сям’я. Калі артысты прыходзяць тут працаваць, яны працуюць амаль цэлае сваё жыццё, колькі Бог дае часу пражыць. Тут былі артысты, якія 40, 50, 60 гадоў працавалі.

*— І таму не мяняюць месца працы?*

— Будуць ролі ці не будуць, грошай менш ці больш, але калі пануюць чалавечыя адносіны, то на гэтым грунце нараджаюцца спектаклі. Усякае мастацтва, калі яно не гаворыць пра самыя добрыя пачуцці, то яно ўвогуле не павінна існаваць.

*— Што з Вашага доўгага акцёрскага вопыту ўспамінаеце найбольш прыемна, чаго нельга забыць?*

— Асаблівай была п’еса Алеся Дударава пра вайну. Яна была пастаўлена ў 1985 г. Я там іграў маладога байца, Лёньку Адуванчыка. Гледачы ў час спектакля плакалі, а сам спектакль стаў жывым помнікам нашым салдатам. Гэта была, можна сказаць, першая роля, калі я адчуў, што са сцэны можна рабіць вялікія справы: плакаць, смяяцца і быць вельмі, вельмі важным... Памятаю яшчэ „Тутэйшых” Купалы. Яны былі пастаўлены ў 1990 г. і ідуць ужо 15 гадоў. Мой акцёрскі жанр — гэта трагікамедыя, якая ёсць асноўным жанрам нашага жыцця. Жыццё трагічнае таму, што канчаецца па зямных мерках смерцю; а смешнае таму, што чалавек спяшаецца дабіцца славы, багацця...

*— Калі чалавек вырашае стаць акцёрам, як успрымае гэта ягонае асяроддзе?*

— Асяроддзе, значыць, сям’я?

*— Так.*

— Калі яны любяць адзін аднаго, то ўсё добра. Мая маці казала, што там, дзе добра табе, добра і мне.

*— Але некаторыя могуць гаварыць, што з працы ў тэатры нельга матэрыяльна ўтрымацца...*

— Былі і такія. Некаторым маім сябрам бацькі забаранілі ісці ў тэатральную школу, загадваючы, каб ішлі на будаўніка, ці ў Політэхнічны інстытут. Але калі бацькі любяць дзяцей, яны будуць любіць усё тое, што з імі звязана.

*— Вам пашанцавала.*

— Я і шчаслівы. У маладосці я быў ціхі і сціплы хлопчык.

*— Спадар Віктар, думаеце, я паверу, што Вы былі такім паслухмяным і пайшлі працаваць у тэатр?*

— Сапраўды, я быў ціхі хлопчык, па паводзінах толькі было пяць. Плакаў, калі дрэнна, нікога не крыўдзіў, сарамлівы, часта чырванеў. Ведаеце, ёсць такая тэорыя, што людзі сваёй працай лечаць, праца — гэта ёсць тэрапія ад сваіх заганаў і недахопаў, а тэатр павінен адрываць людзей ад жыццёвай мітусні, каб чалавек задумаўся, дайшоў да таго, што нешта трэба памяняць у сваім жыцці ў лепшым накірунку.

*— Дзякую за размову.*

**Анна Садоўская**

# Ветэран

Максім СОКУЛ нарадзіўся 19 лютага 1910 года ў прыпушчанскіх Навасадах у сям’і малазямельнага селяніна як першынец. Ягоныя бацькі, Ігнат і Марыя, мелі яшчэ дзесяцёра дзяцей, але васьмёра з іх паўміралі немаўляткамі, а двое ва ўзросце 8 і 14 гадоў.

— Бацькі мае працавалі на 7-гектарнай гаспадарцы, — расказвае Максім. — Зямля ў нас была ліхая, 5 і 6 класаў. Даходы з гаспадаркі не забяспечвалі годнага жыцця, таму бацьку прыходзілася шукаць дадатковага заробку ў лесе, пры высечцы дрэў і леcанасаджэннях. Пачынаючы з 9-гадовага ўзросту я таксама памагаў бацьку. Закончыў я два класы Падставовай школы ў Дубінах, але з прычыны матэрыяльнай нястачы не мог далей вучыцца. На самастойную працу ў лесе стаў я ў 17-гадовым узросце і працаваў там восем гадоў. У вайсковую службу ў Польскае Войска прызвалі мяне ў Брэсцкую крэпасць, дзе я служыў у 1932-1933 гг. Пасля вяртання з войска я ажаніўся і некалькі гадоў жылі мы разам з бацькамі ў Навасадах. У 1938 годзе пераехаў я са сваёй сям’ёй да цесця у вёску Катоўку. Цяжка я тады працаваў у лесе і пры трачаванні дрэва ў гаспадароў па суседніх вёсках. За заробленыя грошы пабудаваў я хату ў Гайнаўцы.

У 1939 годзе змабілізавалі мяне ў войска ў Брэст, а пасля 10 дзён наш дывізіён перавялі ў Варшаву. Там застала нас вайна і мы прымалі ўдзел у абароне сталіцы ад гітлераўскіх захопнікаў. 27 верасня, пасля капітуляцыі Варшавы, папаў я ў нямецкі палон разам з 75 тысячамі польскіх жаўнераў. З Варшавы немцы пагналі нас цераз Гуру-Кальварыю ў Мінск-Мазавецкі, дзе пагрузілі нас у вагоны і павезлі ў напрамку Седльцаў. У таварных вагонах было вельмі цесна, салдаты вымушаны былі стаяць. Транспарт часта кантраляваўся гітлераўцамі.

У час язды ўдалося нам выразаць адтуліну ў дзвярах і адчыніць іх. На 23 кіламетры за Седльцамі мы з сябрам Карольkам з Барысаўкі (памёр ён у 2002 г.) выскачылі з вагона ў адкос і пехатою дайшлі да Буга. Па дарозе далучыла да нас група з 9 польскіх ваеннапалонных.

Была восень. Перайсці раку Буг памагаў нам мясцовы праваднік. Салдаты распрануліся і, трымаючыся за рукі, перайшлі раку бродам. Я, найвышэйшы ростам у групе, ішоў наперадзе, астатнія — за мною.

Максім разам з Карольkам шчасліва дайшлі да чыгуначнай станцыі ў Сямятычах, а адтуль поездам прыехалі ў Гайнаўку. Так закончылася ваенная прыгода Максіма Сокула.

У Катоўцы Максім далей працаваў на гаспадарцы і дадаткова займаўся капаннем калодзежаў. Выкапаў іх у агульным рахунку пад 60, у тым ліку студню ў Крыначцы, якой ён асабліва ганарыцца. У 1976 годзе перайшоў ён на пенсію і адначасна атрымаў ветэранскія правы. Гаспадарку перадаў ён сыну, а абое з жонкай пераехалі жыць у Гайнаўку. Жонка Надзея памерла ў 1995 годзе на 80 годзе жыцця. Максіму Сокулу было прысвоенае афіцэрскае званне падпаручніка.

**Віктар Бура**

# Следам Хрыста

На адкрыццё фатаграфічнай выстаўкі „Следам Хрыста па Святой зямлі”, якое адбылося 11 красавіка ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, прыбылі праваслаўныя вернікі з Беласточчыны і Варшавы. Сярод іх — выпускнікі Гайнаўскага белліцэя. Юрый Астапчук з Варшавы і дыякан Славамір Астапчук з Беластока, аўтары большасці прэзентаваных фатаграфій, з настальгіяй успаміналі вучобу ў Гайнаўскім беларускім ліцэі. Праваслаўнае выдавецтва „Братчык” з Гайнаўкі, якое выступіла арганізатарам выстаўкі, прапануе паглядзець звыш 350 каляровых здымкаў і вялікіх плакатаў. Паказаны на іх святыя месцы, якія наведвалі паломнікі з Беласточчыны. Напярэдадні Вялікадня і ў святочны перыяд гайнаўляне змогуць паглядзець на месцы, у якіх быў распяты Хрыстос і спатыкаўся са сваімі вучнямі пасля Уваскрэсення.

Вернісаж пачаўся з малітвы. Дырэктар школы Яўген Сачко прывітаў гасцей і звярнуў увагу на супрацоўніцтва белліцэя з выдавецтвам „Братчык”, якое раней таксама ў школе ладзіла фотавыстаўкі. З дакладам „Рака Іардан — крыніца жыцця” выступіў епіскап Гайнаўскі Міран. Напомніў ён гістарычныя здарэнні на землях Ізраіля, якія ўвесь час перапляталіся з войнамі і змаганнямі за доступ да вады.

— Вада была крыніцай жыцця і без яе нічога не магло адбывацца. Не знойдзем у гісторыі даўжэйшага перыяду, калі б быў спакой каля Іардана. Аднак паломнікі едуць на гэтую раку, каб абмыць у ёй сваю душу і грахі. Гэтыя фатаграфіі адкрываюць ідэю паездкі ў Святую зямлю. Жадаю вам, каб убачылі вы святыя месцы, раку Іардан і выкупаліся ў ёй, — сказаў епіскап Гайнаўскі Міран, адкрываючы выстаўку.

На вялікай колькасці фатаграфій паказаны святыя месцы Іерусаліма. Аўтары здымкаў прадставілі праваслаўныя цэрквы і іншыя будоўлі, якія належаць Іерусалімскай патрыярхіі і цудоўныя краявіды каля Іардана. Вылучаюцца фатаграфіі, якія рэпартажна паказваюць сыход Благадатнага агню да праваслаўных вернікаў. Можна заўважыць на іх вялікую малітоўную засяроджанасць людзей і радасць ад цудоўнага здарэння, якое штогод адбываецца перад Уваскрэсеннем Гасподнім.

— Калі мы з братам (дыяканам Славамірам Астапчуком — А. М.) даведаліся, што выстаўка будзе прэзентавацца ў Гайнаўскім белліцэі, выпускнікамі якога мы з’яўляемся, ахвотна згадзіліся паказаць нашы здымкі. Я вельмі добра ўспамінаю вучобу ў ліцэі і рады яго наведаць.



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Марк Якімюк падрыхтаваў выстаўку ў белліцэі з думкай аб моладзі, якая штораз ахвотней наведвае святыя месцы

Здымкі мы рабілі ў час нашых паломніцтваў у Святую зямлю. Увекавечылі мы святыя месцы, асабліва дарагія праваслаўным вернікам, якіх не ўбачым у альбомах, — сказаў Юрый Астапчук, які падрабязна расказваў пра месцы паказаныя на фатаграфіях і ўспамінаў цікавыя здарэнні ў час арганізаваных ім паломніцтваў у Святую зямлю.


Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Юрый Астапчук

На выстаўцы многа ўвагі адведзена сабору, у якім знаходзіцца Гасподняя магіла. Паломнікі з Беласточчыны ахвотна наведваюць Віфлеем, дзе нарадзіўся Хрыстос, і ездзяць у іншыя святыя месцы распаложаныя ў Ізраілі. Яны даклад на паказаны на здымках і плакатах. На фатаграфіях па-мастацку паказаны прыгожыя краявіды. Можна ўбачыць Юдскую пустыню і Сінайскую гару. Фатографы не забылі паказаць непаўторную расліннасць. На многіх здымках відаць каменныя храмы, якія прастаялі сотні ці тысячы гадоў. Сярод наведвальнікаў выстаўкі былі асобы, якія пабывалі ў Святой зямлі. Яны, спазіраючы на фатаграфіі, успаміналі сваё паломніцтвы. Былі таксама асобы ахвотныя паехаць у святыя месцы.

Арганізатар выстаўкі, рэдактар выдавецтва „Братчык” Марк Якімюк падзякаваў аўтарам здымкаў, гаспадарам мерапрыемства і спонсарам. Здымкі выконваліся ў атэлье „Фота Стыль” у Гайнаўцы. Побач фатаграфій галоўных аўтараў на выстаўцы можна ўбачыць здымкі сястры Марыі Юрчук, Людмілы і Марка Якімюкоў і Ігара Калядзіна з Масквы. Удзельнікам мерапрыемства быў падрыхтаваны пачастунак. Белліцэісты прапанавалі купіць надрукаваныя на розных мовах кніжкі выдавецтва „Братчык” з апісаннем важнейшых месц Святой зямлі.

— Радзіма Хрыста на Зямлі з’яўляецца жывым Евангеллем накіраваным да ўсіх людзей. Заклікае яна жыць навукай Хрыста і сілай святых месцаў, якія асвяціў Бог наш Хрыстос, узмацняцца ў веры. Жадаем, каб выстаўка заахвочвала нас ісці следам Хрыста ў Радзіму нашага Тварца, што знаходзіцца ў Нябёсах, — заявіў арганізатар выстаўкі Марк Якімюк.

**Аляксей Мароз**

# Аб крыніцы і часе



*Першае: карціна з дна памяці, з краіны дзяцінства, ды калючая, сардэчная. Вечныя канікулы. Зараз жа ля дарогі, што вядзе з Падрэчан у Ракавічы — дарога, дарожка ў напрамку змрочнага лесу — тут і студня з жоравам, а да студні хлопец з загарэлай аж да чарнаты спіной вядзе каня.*

*А пасля ў сне скрыпеў той сам жораў, а на чырвоным кані пад’язджала да студні дзяўчына ў белай хустцы на галаве. У сне гэта адбывалася па-за часам і па-за прасторай, у нерэальным святле, ні рання, ні вечара, у чужой краіне. Сёння, калі я больш дасведчаны жыццём-быццём, абстукі ў псіхааналізе, сексуальны падтэкст вобразу дзяўчыны на кані здаецца мне быць несумненным.*

*А калі вяртаюся пасля шмат, шмат гадоў і светаў, дарога, дарожка ў напрамку Ракавіч — быццам бы тая самая, ды прапаў жораў, прапала студня, а на месцы студні стаіць новы, салідны плот з вострымі частаколінамі. Ды, дарэчы, адкуль я тут, — жыхар дэкадэнцкага горада, пасярод запрацаванага рэальнай работай вясковага люду. Бо ў сапраўднасці паддаюся я хвалі літаратурнага, штучнага імпрэсіянізму, мястовага лірызму.*

*Карл Маркс, здаецца, не пераносіў вёску, пісаў аб „ідыятызме вясковага жыцця”, а тую нялюбасць да вёскі, да халопскага класа пераняў праваднікі расійскага бальшавізму. Вясковая грамадскасць уяўлялася ім як апора цемры, адсталасці. Старой, патрыярхальнай вёсцы неабходна было аб’явіць вайну, а збудаванай на яе руінах новай вёсцы прышчапіць імпэт да сучаснасці, любоў да хуткай перамены. Бальшавіцкая расправа з вёскай была крывавай, неахвотныя камунізму кажуць пра вайну аб’яўленую расійскаму народу, а таксама іншым народам, уваходзячым у склад расійскай імперыі.*

*Сёння ж міф вёскі, вясковага дзяцінства быццам бы адраджаецца, міф вяртання да крыніц здаецца быць неад’емнай рысай прынамсі ў краінах Сярэдняй Еўропы; гэта пытанне жывое не толькі сярод жыхароў вёскі, а прынамсі ў некаторых колах інтэлігенцыі, тае з гуманістычным ухілам. Вясковае дзяцінства вабіць заклікам акунуцца ў жывую, адроджаную, новую супольнасць. Тая супольнасць мае быць супрацьвагай на пагрозы з боку гарадской цывілізацыі, якая бачыцца як свабодны пераплыў капіталу, людзей, з’яў культуры, значыць — глабалізацыя. Тая свабода, усё ж, азначае цяжар, выклік, натугу рупнай працы, а тая супольнасць абяцае зняць ярмо свабоды, абяцае падмогу расплысціся індывідууму ў бязмежным, містычным, вечным „цяпер”. Абяцае вяртанне ў бязгрэшнае, чыстае дзяцінства, у вечныя канікулы.*

*А я, недаверлівец, пры глядаюся тым абяцанкам, бо што ж мне ад бяспамяці аб рэальных, гістарычных падзеях, катаклізмах, паразах... Што нам сёння ад прыгожых абяцанняў?*

*Здаецца, вось, што жыццё тут і цяпер, цяжкае, бо адказнае, мусіць заўжды станавіць раўнавагу паміж самотным, збалелым, сумнiўным, поўным ваганняў-нерашучасці „я”, індывідуумам, адзінкай — а супольнасцю, грамадствам, масай, якая бывае таксама пагрозлівай і знішчальнай.*

**Ежы Плютовіч**

Адгалоскі

# Пра „Ніву” — якая праўда?

У 9 н-ры „Нівы” ад 27 лютага 2005 г. друкаваўся допіс Мікалая Панфілюка п.з. Пра „Ніву”, у якім аўтар так піша: „Гэта найлепшая газета ў Польшчы і ёй роўнай няма! Тут знойдзеш усебаковую праблематыку, па душы і сэрцу”. Далей М. Панфілюк робіць „агляд” паасобных публікацый і аўтараў. Не хачу быць з’едлівым, але дзеля гістарычнай справядлівасці хачу прывесці Панфілюковую ацэнку „Нівы” з дзевяностых гадоў. У 24 н-ры салідарніцкай газеты „Tygodnik Białostocki” друкаваўся яго ліст п.з. „Wyznawcy niejednego Boga”, у якім піша „jako Białorusin, ktory był na wozie i pod wozem”: „A skomunizowana «Niwa» pod dyktando partii i jej pochlebców zawsze na pierwszej stronie wychwalała różnych sekretarzy partii, naczelników gmin i ich popleczników, łgając w żywe oczy o ich «bohaterstwie» za zgodą też skomunizowanego i dziś już skompromitowanego BTSK”.

Хацеў бы я ў гэтым месцы адзначыць (з таго, што прыпамінаецца), што гэта М. Панфілюк, як шматгадовы авангардны карэспандэнт хваліў усіх чыноўнікаў, як зараз робіць з супрацоўнікамі „Нівы”. Няўжо мінулае вылецела з памяці? Але не з’едлівасць з’яўляецца мэтай маёй адгалоскі. Разумею, што чалавек у жыцці блудзіць і робіць неразважлівыя памылкі, як мне здарылася ў публікацыі „Тры пакаленні” пра вітаўскую вуліцу. Асноўная справа — гэта „пакаянне” ў сваіх грахах. Каб такое больш не здарылася. А паважаны калега ідзе далейшым шляхам. Мне здаецца, што шматгадовы супрацоўніку пад сілу напісаць цікавы артыкул з Дубіцкай гміны аб праблемах штодзённага жыцця селяніна ці пагранічнай стражы, якая ад некалькіх гадоў там працуе. Тэмаў хоць адбаўляй. Трэба адно ахвоты для таго ж пісання. Спадзяюся, што Мікалай Панфілюк не пакрыўдзіцца за гэты тэкст.

**Уладзімір Сідарук**

*Але і сёння Навагрудчына не збяднела на таленты і сапраўдных патрыётаў. Каб у гэтым упэўніцца, дастаткова зазірнуць у Інтэрнэт на сайт...*

# http://ztmn-bel.narod.ru

Навагрудская зямля — гэта гістарычныя мясціны. З імі звязаны не толькі тыя падзеі, што адыгралі значную ролю ў беларускай мінуўшчыне, але і тыя, якія сталі знакавымі ў гісторыі і культуры суседніх народаў. Варта толькі згадаць імя Адама Міцкевіча і Навагрудскі перыяд гісторыі Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.

Але і сёння Навагрудчына не збяднела на таленты і сапраўдных патрыётаў. Каб у гэтым упэўніцца, дастаткова зазірнуць у Інтэрнэт на сайт http://ztmn-bel.narod.ru. Менавіта тут мы маем магчымасць пазнаёміцца з мясцовай творчай моладдзю. Сайт так і называецца „Згуртаванне творчай моладзі Навaградчыны «Замкавая гара». Гэтыя словы чырвонымі літарамі на светла-карычневым фоне выдзяляюцца ў версе вэбстаронкі. З левага боку ад яе — выява руін навагрудскага замка, а пад ёй — вельмі дзіўны, да смешнага наіўны заклік: „Трэба мову беларускую папулярызаваць, бо ніхто не хоча на ёй размаўляць!" Адразу ўзнікае пытанне, а чаму гэта ніхто не хоча размаўляць на беларускай мове, тым больш, што каля 80% насельніцтва Рэспублікі Беларусь лічыць яе роднай, не кажучы ўжо аб беларускай меншасці ў іншых краінах і дыяспары, раскіданай па ўсім свеце? Патлумачыць такую безапеляцыйную дэфініцыю можна хіба юнацкім максімалізмам.

Галоўная старонка аформлена даволі строга. З левага боку выйсці да іншых рубрык сайта. У сярэдзіне — блок навінных паведамленняў, які мае пэўную самастойнасць. Каб прачытаць усе навіны ад „Замкавай гары", дастаткова перасоўваць іх у адпаведным акенцы, не рухаючы ўсёй старонкі. Дарэчы, менавіта з гэтай стужкі паведамленняў мы даведаемся, што згуртаванне ўзнікла нядаўна — у сярэдзіне сакавіка. Апошні штрых да навінаў не будзе прыемным — у іх абсалютна няма згадкі пра 25 Сакавіка.

Цяпер прашпацыруем па рубрыках сайта. Варта адзначыць, што націскаючы на іх зменяецца толькі выяўленне ў згаданым акенцы — усё астатняе застаецца на сваім месцы і не рухаецца.

Рубрыка „Наш горад" уяўляе сабой расповед пра Навагрудак, ці Наваградак, як называюць яго на сайце. Шчыра кажучы, менавіта такая форма больш адпавядае старадаўняй, непаланізаванай назве. „Гарады, гарады... — пішуць «замкаўцы». — Яны прыйшлі да нас з розных стагоддзяў, непадобныя адзін да аднаго сваім мінулым і аднольковыя сучасным нялёгкім лёсам. Сярод іх ёсць асабліва хвалюючыя сваёй старажытнасцю і загадкавасцю. Такі і наш родны Наваградак". Акрамя тэксту на старонцы змешчаны тры здымкі.

Найбольш цікавай падаецца рубрыка „Творчасць". Тут сябры „Замкавай гары" выносяць на суд віртуальных вандроўнікаў свае вершы. А яны зусім неблагія і прысвечаныя менавіта роднай зямлі. Каб нікога не пакрыўдзіць, цытаваць іх, лічу, не трэба, але згадаць пра назвы не перашкодзіць. „Няма слова, лепшага за беларускае слова", „Мы нарадзіліся на белай зямлі", „Беларусь" і іншыя. Зразумела, моладзь не ўяўляецца без палымянага кахання, таму ў „Творчасці" шмат вершаў прысвечана гэтаму пачуццю. Сярод іх „Любоў мая...", „Як я сустрэў каханне, ці як каханне сустрэла мяне", „Вользе" і гэтак далей.

**Уладзімір Лапцэвіч**

*Галоўная зборная Беларусі пачала падрыхтоўку да травеньскага чэмпіяната свету...*

# Беларусь, беларусы...

### Новы штаб, новыя спадзевы

Рыжская параза хакейнай зборнай дружыны ў алімпійскай кваліфікацыі яшчэ доўга будзе вярэдзіць душэўную рану заўзятараў, але жыццё не стаіць на месцы. Прыходзяць новыя турніры, перамогі і расчараванні. Беларускі хакей пасля лютаўскай горычы ўжо паспеў зведаць пераможнай асалоды. Зусім нядаўна завяршылася турнірнае першынство краіны. Яго з пэўным правам можна называць малым чэмпіянатам Усходняй Еўропы, паколькі ўдзел у турніры бяруць мацнейшыя клубы не толькі Беларусі, але і Латвіі з Украінай, ці іншымі словамі тых краін, якія маюць у хакейным свеце ўстойлівую рэпутацыю. Беларускія каманды выразна дамінавалі ў першынстве і занялі ўвесь п'едэстал. Другі год запар чэмпіёнам стала мінскае „Юнацтва" пад кіраваннем Міхаіла Захарава. У фінальнай серыі гэты клуб перамог сталічны „Керамін" з агульным лікам 4:1. Заўважым, што керамінаўцы трэці год запар спыняюцца за адзін крок да вяршыні. У спаборы да дзвюх перамог за бронзу магілёўскае „Хімвалакно" ў двух матчах адолела кіеўскі „Сокал". Лепшым снайперам чэмпіянату стаў гулец нацыянальнай зборнай Беларусі і „Кераміну" Яраслаў Чупрыс — на яго рахунку 68 ачкоў (29 закінутых шайбаў плюс 39 галявых перадач), другім стаў ягоны партнёр па звяну Аляксей Круцікаў — 62 пункты (20+42), трэцім — ветэран беларускага хакея Аляксандр Гальчанюк з „Хімвалакна" — 61 (19+42). Гэтая тройца намнога апярэдзіла іншых снайпераў.

У чэмпіянаце Расіі сёлета ў прызёры трапіў толькі адзін беларус — Алег Белкін у складзе тальяцінскай „Лады" здабыў срэбны медаль.

А днямі ўсцешыла юнацкая дружына. Пасля гадавога перапынку беларусы вярнулі сабе месца ў элітным дывізіёне. У турніры, які праходзіў у Славеніі, змагаліся 6 каманд. Нашы атрымалі перамогі ў чатырох сустрэчах — 5:0 з Вялікабрытаніяй, 3:2 з Казахстанам, 8:2 з Аўстрыяй, 5:3 са Славеніяй, а саступілі толькі французам — 2:3. Апошняя гульня з гаспадарамі пляцоўкі славенцамі была па сутнасці фінальнай. Выхаванцы маладога трэнера Васіля Панкова (у нядаўнім мінулым цэнтрфорварда зборнай Беларусі) у асабістай сустрэчы падцвердзілі, што яны мацнейшыя.

Галоўная зборная Беларусі пачала падрыхтоўку да травеньскага чэмпіянату свету. Новы трэнер канадзец Глен Хэнлан адразу запрапанаваў новую мадэль гульні. Сфармаваны і новы трэнерскі штаб (раней Міхаіл Захараў па сутнасці адзін рыхтаваў каманду). У дапамогу заакіянскаму коучу пакліканы дасведчаны Анатоль Варывончык, які калісьці сам нямала пакіраваў нацыянальнай дружынай, а таксама Эдуард Занкавец, былы хакеіст зборнай, які добра ведае англійскую мову і запрошаны для лепшай камунікатыўнасці. З галкіперамі асобна працуе Аляксандр Шумідуб. Змены ў камандзе будуць пакуль невялікія. Хэнлан ужо адмовіўся ад паслуг абаронцы-ветэрана Алега Мікульчыка, а таксама „адчапіў" ад складу аднаго з лідэраў апошніх гадоў Аляксея Калюжнага. Рэч у тым, што форвард вельмі крытычна выказваўся ў прэсе наконт прызначэння галоўным трэнерам заакіянскага спецыяліста. У выніку яго ў зборную не выклікалі. Хто меў рацыю, пакажа толькі час.

**Уладзімір Хільмановіч**

# *Занатоўкі кантрабандыста*

### Мытныя жарты

*Той, хто лічыць, што ў супрацоўнікаў мытні бракуе пачуцця гумару, ні халеры не разумее ні ў гумары, ні ў спецыфіцы працы людзей з вышэйшай універсітэцкай адукацыяй, якім кожны дзень даводзіцца капацца ў чужых рэчах, каб знайсці там што-небудзь карыснае для сябе. Такая работа негатыўна ўздзейнічае не толькі на настрой кантрабандыста, у машыне якога мытнік знайшоў на тры бутэлькі гарэлкі менш, чым той схаваў (а тых бутэлек усё адно няма), але і на стрэсавы стан самога ахоўніка эканамічных інтарэсаў дзяржавы. Бо гледзячы на такія аб'ёмы тавару, якія ўвозяцца і вывозяцца праз яго працоўнае месца, з кожным днём мацнее перакананне, што ўсе людзі па абодва бакі мяжы нашмат багацейшыя, пасп яховейшыя і перспектыўнейшыя за яго.*

*Прыгнечаны настрой старэйшага інспектара Анатоля Куца ўзмацняўся яшчэ з-за двух фактараў. Па-першае, яго страўнік, ныркі, пячонка, сэрца і душа патрабавалі пасля ўдалага ўчарашняга вечара пахмелкі. А гэта катэгарычна не супадала з поглядамі кіраўніка змены. Наадварот. Той, убачыўшы ў вачах Куца агонь інтэлекту, які дапамагае знайсці спіртное нават у сейфе свайго шэфа, пільна сачыў за дзеяннямі падначаленага. Пасылаў таго працаваць то на ўезд, то на выезд, абы не стаяў на адным месцы. Другі фактар быў больш празаічны і менш варты ўвагі. Уначы, падняўшыся папіць вады, Анатоль убачыў, як каханая жонка лазіць па кішэнях яго мундзіра ў пошуках непрапітага. Прычым, яна рабіла гэта з такім спрытам, што інспектар мытні шчыра пазайздросціў настольні адпрацаванаму майстэрству. У іх на працы, наўрад ці хто, нават за доўгія гады службы, спрактыкаваўся да такога прафесіяналізму.*

*Карацей, стан мытніка набліжаўся да крытычнага. Ён нават не правяраў машын. Задаваў банальнае пытанне: „Што вязеце?", і, не правяраючы ці праўду на гэты раз сказалі падманшчыкі-кантрабандысты, ставіў пячатку ды прапускаў машыну за мяжу. Чакаў аднаго: калі скончыцца сама доўгая ў яго жыцці змена.*

*Так бы ўсё банальна і завяршылася б, каб не Васіль Бондар. Пра Васіля казалі — дохлага спадмане. Дзе не возьме падманам — то нахабствам. А дзе забракуе праўды — аджартуецца. І калі ён пачуў нічога не азначаючае сумнае пытанне Куца: „Што вязеце?", адказаў з яхідна-жартаўлівай усмешкай:*

*— Ды нічога забароненага. Вязу толькі зброю ды наркотыкі.*

*Інспектар усміхнуўся. Прапусціў Васіля без праверкі. І нават пажадаў таму ў думках поспехаў. Ці часта пачуеш такі трапны жарт. Але, калі праз гадзіны чатыры, вяртаючыся назад, Бондар, на тое ж самае пытанне Куца даў той жа самы адказ — мытнік пачырванеў як жаба, якая замест мухі праглынула ката. „Ніколі кантрабандыст, які хоць трохі сябе паважае, не адмоўныць аднаго і таго ж жарту таму самаму мытніку, — у роспачы падумаў Куц. — І ніколі мытнік, у якога ёсць гонар за сваю прафесію, не даруе такога нахабства".*

*— Ага! Кажаш зброю ды наркотыкі. Добра што прызнаўся. Гэта змякчыць пакаранне. Бо па гэтаму артыкулу кара вымяраецца не гадамі, а дзесяткамі гадоў. Давай, паказвай, дзе схаваў, — абапёрся аб машыну кантрабандыста інспектар.*

*— Ды вы што, жарту не зразумелі? — збялеў Бондар.*

*— Якія жарты, — павысіў голас Анатоль. — Мы не на зборышчы блазнаў. Мяжа не церпіць жартаў. Не хочаш аддаваць кантрабанду сам, то знойдзем без тваёй дапамогі. Гані машыну на яму.*

*Як Васіль не прасіў, нічога не дапамагло. Куц разабраў машыну на часткі. Павымаў сядушкі, параскручваў дзверкі, нават прымусіў разбарціраваць запаску. Невядома што яшчэ прыдумаў бы зрабіць з той машынай, каб не закончылася змена.*

*— Ну што, — паглядзеў на гадзіннік мытнік. — Спадмануў ты мяне. Ніякіх наркотыкаў ды зброі ў цябе няма. Збірай свой самакат і знікай з маіх вачэй.*

*— Я ж пажартаваў, — агрызнуўся пакрыўджаны Бондар.*

*— Я таксама, — задаволена ўсміхнуўся Куц. — Настрой у мяне сёння такі. На гумар цягне. Сумна было мне, вось і павесяліліся.*

*Ён павярнуўся каб пайсці, і толькі цяпер заўважыў за сваімі плячамі начальніка змены. Валасы ў мытніка падняліся як шыпы марской міны.*

*— За перавышэнне паўнамоцтваў і здзек з грамадзяніна нашай краіны ты звольнены з працы, — адрэзаў начальнік.*

*— Вы што, жартуеце, — паглядзеў Анатоль на шэфа як галодны сабака на гаспадара, які корміць ката свежым мясам.*

*— Яшчэ не ведаю, — адказаў той. — Заўтра скажу больш дакладна ці гэта жарт. Пагляджу які ў мяне будзе настрой. Можа будзе цягнуць на гумар, а можа не.*

**Сымон Нальшанскі**

# Св. памяці д-ра Уладзімежа Стохеля
## (1945-2005)

**7 красавіка г.г. у варшаўскім шпіталі на 61 годзе жыцця адышоў ад нас вядомы літаратуразнавец, славіст-беларусіст, былы загадчык Сектара ўсходнеславянскіх літаратур колішняга Інстытута славяназнаўства Польскай Акадэміі навук у Варшаве і былы наменсік дырэктара гэтага ж Інстытута, а пазней ад'юнкт Вармінска-Мазурскага універсітэта ў Ольштыне, доктар гуманітарных навук Уладзімеж Стохель. Вучоны даследаваў гісторыю беларускай літаратуры XIX-XX ст.ст., узаемасувязі польскай і беларускай літаратур.**



Яшчэ бачу, Сябра, Тваю выцягнутую на прывітанне руку тую ў 1985 годзе, калі ўпершыню прыходзіў я ў Твой Сектар усходнеславянскіх літаратур, разам з Табою працаваць, займацца адным і тым жа — беларускай літаратурай. Памятаю Тваю шчаслівую ўсмешку, што не будзеш адзін, прыходжу Табе як быццам у падмогу. Так мала нас было тады, усяго толькі двух на ўвесь Сектар Інстытута славяназнаўства Польскай Акадэміі навук. Колькі ж было тады шчасця і надзеі, што нас хоць крыху, але прыбывае.

Прыходзіў я тады пасля паражэння сваёй ідэі і веры ў братэрства нацый. Там-сям перамагала нацыяналістычная балбатня. За нішто лічыліся погляды іншых, чалавечая годнасць. Пакідаў я Беласток усё ж, мабыць, у той час шчаслівa. Польская Акадэмія навук шырока адкрывала перад намі свае дзверы. Шчаслівыя з гэтай прычыны заядла працавалі мы на навуковай ніве.

Гэта Ты натхніў мяне на мой першы навуковы артыкул, з якім выступіў я ажно ў Зялёнай Гуры. Памятаю, ехаў я тады разам з сённяшняй праф. Вандай Супай. Была бяссонная ды не адна ноч. І гучныя воплескі пасля выступлення. Быў гэта час цяжкай барацьбы за існаванне ў навуцы. Ніхто не лічыў прапрацаваных свабодных субот ці нядзель. Ніхто не эканоміў сіл.

І ўсё, мабыць, так працягвалася б, калі б у 1991 г. у Акадэміі не наступіў час „дэмакратычных" перамен. Дакладна памятаю, як на навуковай радзе Твае публікацыі паслужылі за адну з прычын звальнення ўсіх нас з працы. „Дэмакратычны" прыступ історыі прымусіў тады адысці з працы ажно 35 вучоных! Шмат сярод іх было прафесараў і дацэнтаў, габілітаваных ды і не толькі дактароў. Мне наймалодшаму з Вас давялося кіраваць тады акцыяй абароны, якая аднак да нічога не давяла. Рэзультат быў сумны, але ніхто з нас не паў яшчэ тады духам. Заядла і ў пень была ліквідавана польская беларусістыка, якую ў Сектары ўсходнеславянскіх літаратур, калі не лічыць праф. Васіля Белаказовіча, прадстаўлялі ўсяго толькі мы з Табою, усяго ледзь дзве асобы. Паляванне на ведзьмароў і вядзьмаркі даводзіла да гратэскавых сітуацый! Чалавек траціў веру ў навуку, у другога чалавека, у чалавечнасць.

І хоць не палі мы духам, то ўсё ж трацілі навуковую ці якую-небудзь увогуле працу на шматлікія гады, а то і назаўсёды. Так кончылася тады для нас „дэмакратыя".

Табе, Сябра, як быццам бы крыху пашчасціла. Хоць і Ты, так як пазней і я, спазнаў горкі хлеб беспрацоўя, будучы раней наменсікам дырэктара Інстытута славяназнаўства Польскай Акадэміі навук, усё ж удалося зачапіцца Табе за Вармінска-Мазурскі універсітэт, адзін з нешматлікіх тады для нас прыхільных. Шчасце не аказалася вечным.

Спі спакойным сном. Хай сніцца Табе Твой колішні сябра Юрка, увесь наш былы Сектар усходнеславянскіх літаратур і сінявокая Беларусь.

Вечная Табе памяць!

**д-р Юрый Трачук,**
Падляшская акадэмія
ў Седльцах, Каталіцкі
люблінскі універсітэт

# Не хвалі пагоду

Восенню мінулага года праклалі водаправод у вёсцы Бялкі, што ў Нарваўскай гміне. Пісаў я аб гэтым у „Ніве" н-р 50 ад 12.12.2004 г., дзе расхваліў працу прадпрыемства „Тэхносан" з Беластока, кіраўніка работ Міхала Лукшу ды рабочых.

Час прайшоў і аказалася, што не ўсё так гладка выглядае. Створаны ўлетку грамадскі камітэт пабудовы водаправода, які меў каардынаваць працу паміж жыхарамі вёскі, прадпрыемствам, гмінай ды павятовым праўленнем дарог, патрэбны быў толькі дзеля збору грошай ад людзей і перадачы іх прадпрыемству.

Калі Павятовае праўленне дарог з Гайнаўкі прымала пракладку водаправода, то і на дарозе, і на вуліцы работа была яшчэ незакончана. Чыноўнікі на аўтамашыне праехаліся вуліцай ды дарогай і ў канцы вёскі прынялі завяршэнне пракладкі, а жыхарам казалі насупраць сваіх сядзібаў папраўляць. Дарожныя ўлады не звярнуліся да Грамадскага камітэта пабудовы водаправода, каб супольна прыняць адрэзкі дарогі і вуліцу, дзе праходзіла пракладка.

Таксама дарогай з Сакоў у Бялкі павялі водаправод іншым шляхам, чым была геадэзістамі падчас камасацыі замерана дарога, якая цяпер з'яўляецца гміннай дарогай. Калі Надлясніцтва Жэдня пасадзіць лес на г.зв. старой дарозе (якая цяпер з'яўляецца планавай дарогай на карце), то жыхары Сакоў не даедуць у Бялкі, і наадварот, не ўспаміная ўжо аб хуткай дапамозе, якая зусім не праедзе.

**Мікалай Лук'янюк**

# Жалобны ліст

*Я спяшаюся напісаць гэтае, каб пераканаць свет у тым, што смерць велічнага чалавека не можа пакінуць беларуса абыякавым — нават калі ягоныя рэлігійныя меркаванні далёкія ад каталіцтва.*

*Навіна пра тое, што Ян Павел II памёр, хутка разнеслася па Мінску. Людзі разумелі ўсю глыбіню падзей. Людзі спачувалі, жылі гэтымі падзеямі.*

*Так здараецца заўсёды, калі адыходзіць у нябыт ідэал. Глупства, што чалавек можа існаваць без веры ў святасць, у Бога, цвёрда стоячы на пазіцыях атэізму. Вера ў дабро атаясамліваецца чалавечым розумам з Панам Богам; пазбавіўшы чалавека неба, мы ператвараем яго ў пачвару не вартую зямлі.*

*Пантыфік канцэнтраваў у сабе „белае", быў моцнай перашкодай для „чорнага". На жаль, быў. У гадзіну яго адыходу мы адчулі разгубленасць і не верылі тэлебачанню да апошняга.*

*„Папа паміраe", — сказаў я ў суботу на вуліцы. І ў адказ: „Няма слоў... Толькі жаль ды малітва".*

*Мы лічылі, што магчымы цуд. Але прырода забаўляецца сваімі гульнямі.*

*Толькі зараз мы здольны ацаніць Яго. Не трэба ні громкіх, ардынарных фраз аб здзейсненым, ні параўнанняў. Галоўным Яго дасягненнем было тое, што Ён застаўся Чалавекам.*

*Ва ўяўленні мільёнаў беларускай моладзі пантыфік і Ян Павел II — аднолькавыя паняці. У іх сэрцах зараз гучыць голас: „Сапраўды, мы згубілі айца".*

*Мне, паэту і прадстаўніку новай плыні беларускага мастацтва, здаецца вар'яцтвам жаданне Ватыкана пакінуць Яна Паўла II у Рыме. У першую чаргу Ён быў патрыётам роднай Польшчы і змагаром за яе незалежнасць ад „большевистской" заразы. Ягонае месца — на славянскай зямлі, дзе спакон веку пакутвалі і былі па-сапраўднаму шчаслівымі прашчуры Караля Юзафа...*

*А ў душы кожнага беларуса набывае моц надзея, што новы рымскі біскуп будзе варты светлай памяці Яна Паўла II, будзе варты заняць Ягонае месца на Святым Прастоле.*

*Калі паміраe звычайны чалавек, сэрца ные ад думкі пра непатрэбнасць чалавечага быцця. Калі паміраe ксёндз, падобны боль заглушаны спаконам, з якім ён адыходзіць. Прычына спакою — разуменне, што жыццё, пражытае для свету дзеля Пана Бога, не выкінута на памыйніцу.*

***Сучасны беларус***
*(Мінск)*

# За чужым хлебам

Штораз часцей думаю, што буду рабіць пасля заканчэння адукацыі на універсітэце. Складаная сацыяльна-эканамічная сітуацыя прымушае нас, маладых, да пошукаў работы далёка за межамі нашай краіны. Ужо нават у вялікіх гарадах, як Варшава, цяжка знайсці добра платную працу. Штораз большым зацікаўленнем з боку маладых людзей карыстаюцца курсы замежных моў. Гэта падрыхтоўка да летніх выездаў за мяжу. Хаця б у „The Tower" — моўным цэнтры па вуліцы Сянкевіча можна прывучыцца замежнай мове за 694 злотых у семестр. Гэта нядорага. Як грыбы пасля дажджу паўстаюць шматлікія лінгвістычныя цэнтры, у якіх можна прывучыцца не толькі заходнім мовам, але нават... рускай. Эканамічныя ўмовы спрыяюць развіццю гаспадарчага абмену Польшчы з Усходам, таму неабходнае веданне хаця б адной заходняй мовы ды безумоўна рускай. Пасля заканчэння эканамічнага аддзялення можна знайсці працу як нэгацыянт у фірме. Прыкладам можа быць мой знаёмы, які пасля заканчэння белліцэя паступіў на спецыяльнасць міжнародныя кантакты. Зараз хлопец з'язджае за хлебам у Расію, Украіну ці іншыя рэспублікі былога СССР. Хто штудзіруе іншыя спецыяльнасці, выязджае на Захад. Цяжка дастацца ў ЗША, там неабходныя візы. Апошнія размовы палітыкаў абодвух краін, хаця польская армія ў стабілізацыйнай місіі ў Іраку дапамагае Амерыцы, аптымізму не навяваюць. Апошнім часам папулярнасцю аматараў працаваць за мяжой карыстаюцца такія краіны, як Італія, Францыя ці Ірландыя. Там рынкі працы адкрыты на маладых людзей.

Ну што ж:

*Акрайчык чужога хлеба*
*Пад неспакойным небам*
*Корміць нас потам на чужыне*
*Слязою тужліваю па радзіме*
*Лечым кожны наступны дзень*
*Тут цяжка сустрэць зору*
*А неба тое ж самае для ўсіх людзей*
*Шукаем добрага свету*
*Шукаем акрайчыка неба*
*Шукаем люстра сваіх мараў*
*Чакаем на добры час*
*Што спалучыць нас*

**Юрка Буйнюк**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Nakład**: 1 924 egz.
**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*

*Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.*
**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Сакратар рэд.:** Аляксандр Максімюк.
**Рэдактар „Зоркі":** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Камп'ютэрны набор:** Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
**Друкарня**: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2005 r. upływa 5 czerwca 2005 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2005 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

# „Партызанская школа” на гастролях

**25-28 красавіка навучэнцы зачыненага Беларускага ліцэя разам з сябрамі рушаць у Польшчу са сваёй новай старой рок-праграмай „Партызанская школа”. Плануюцца выступы ў Варшаве, Познані і Гайнаўцы.**

У кастрычніку мінулага года, трэба сказаць, ліцэісты ўжо ездзілі ў Польшчу на гастролі. Тады, пасля двух забароненых у Мінску канцэртаў, польскі прадпрымальнік Ігар Знык вырашыў дапамагчы і арганізаваць тры выязныя канцэрты. Дзесяць удзельнікаў праекта выступілі ў Варшаве, дзе сабралі мясцовую беларускамоўную публіку, Гайнаўцы, дзе на канцэрт у залу ўпіхнулася каля 350 чалавек, і Бельску з паўнюткім Домам культуры. Гэта былі своеасаблівыя канцэрты салідарнасці з Беларускім ліцэем.

Праграма канцэрта называецца „Партызанская школа”. Яна ўключае ў сябе новыя песні, новыя апрацоўкі, пэрформансы ад музыкаў, музычныя конкурсы, аўкцыён рэдкіх і цяжкадаступных беларускіх рэчаў, звязаных ці то з палітыкай, культурай і гісторыяй, ці то з беларускай музыкай. Удзел прымуць каля 20 музыкаў, якія граюць у самых розных жанрах і музычных плынях. Адзін пералік інструментаў чаго варты: да традыцыйных акустыка-, электра- і бас-гітараў, бубнаў далучаюцца клавішы, труба, саксафон, акардэон, там-там, акарына. Арганізатары абяцаюць незвычайнае шоу з незвычайнай музыкай і незвычайнай атмасферай.

Ліцэйскія дзяўчаты з гурту „Trajektorya” выканаюць свае рамантычна-эратычныя кампазіцыі, а таксама небезвядомую бардаўскую песню „Боль”. Коля Тоўсцік, малады абаяльны 15-гадовы мачо, прадэманструе свае змагарна-пазітыўныя і фатальна-апакаліптычныя напрацоўкі. Гурт „Medium” будзе выконваць патрыятычны лёгкі панк, lo-fi-rock, брыт-поп. „СКА!РБ” — пакажуць музыку ў святле рэтра, стылю СКА. Патрыятычна, рэвалюцыйна і па-беларуску. „Parason” — прадстаўнік новай генерацыі гуртоў альтэрнатыўнай музыкі — рэпрэзентуе кавэр „Нам ня трэба вашых школаў” на песню „Pink Floyd” „We don't need your education...” ды іншыя песні. Слынны Андрэй Хадановіч у супрацоўніцтве з Аляксеем Крукоўскім выканаюць лёгкі „сцёбны” музычны набор кавэраў, пераробак, эксперыментаў на беларуска-польскую тэматыку, згладжваючы неспалучальныя кантрасты імпрэзы.

Арганізатары вераць, што пасля гэтых канцэртаў пачнецца другі этап падрыхтоўкі новага ліцэйскага дыска — запіс. Практычнае выкананне дазволіць адшліфаваць мелодыі і выпрабаваць іх на слухачы.

Канцэрты адбудуцца 25 красавіка ў 19.00 у клубе „Пункт” у Варшаве, 26 красавіка ў 18.00 Centrum Kultury „Zamek” у Познані і 27 красавіка ў Гайнаўцы. Месца пакуль невядомае. Запрашаем!

„Partyzancka szkoła” — новая шоу-праграма музычнага праекта „Я люблю ліцэй” з удзелам: Колі Тоўсціка, Іллі Навуменкі, Адэлі Дубавец, Андрэя Хадановіча, гуртоў „Trajektorya”, „SKA!RB”, „Parason”. Квіткі на ўваходзе.




Фота ГЛЕБА ЛАБАДЗЕНКІ

# „Даўціпы” Андрэя Гаўрылюка

У гасціне Янка заахвочвае бландзінку:

— Выпі, будзеш ахвотнейшая.

— Я і так ахвотная, толькі з цябе разявака.

* * *

— Паслухай добрай рады спрактыкаванай жанчыны і выйдзі замуж, — раіць бландзінка брунетцы.

— Я, вось, і чакаю, каб мне гэта запрапанаваў нейкі неспрактыкаваны мужчына.

* * *

Жонка лае мужа:

— Зноў, п'яніца, вяртаешся ў тры гадзіны ночы!

— Бо я вяду сістэматычны лад жыцця.

* * *

Між мастакамі:

— Мой сябра напісаў сваёй жонцы партрэт.

— Падобная яна там на сябе?

— Хіба так, бо дагэтуль нікому яго не паказала.

* * *

Сустракаюцца два мастакі:

— Куды ідзеш?

— На выставу.

— А хто ж там будзе цябе глядзець?

* * *

На выстаўцы сужонства стаіць перад актам прыгожай жанчыны. Муж захапляецца перад жонкай:

— Цалкам падобная да цябе!

— Гэта праўда, — падтаквае яна. — Я таксама не маю чаго на сябе апрануць.

* * *

Па чыгунцы ў малым мястэчку прамчаўся цягнік. Пасажыр пытае загадчыка станцыі:

— Куды паехаў той поезд?

— У Еўропу.

— А адкуль гэта ведаеце?

— Бо ў нас не спыніўся.

* * *

Паляўнічы хваліцца перад сябрамі сваім меткім вокам. Каб паказаць свае ўмеласці страляе ён да пралятаючай гусі. Гусь ляціць далей.

— Сябры! — крычыць ён, — цуд, цуд! Упершыню ў жыцці бачу лятучую мёртвую гусь.

* * *

Гутараць два паляўнічыя:

— Я да зайчыкаў страляю з адлегласці чатырохсот метраў.

— Так далёка немагчыма папасці.

— Я не гавару што пападаю, толькі што страляю.

# Адгаданка




1. буйная тэрытарыяльная адзінка або гранічная лінія, 2. вертыкальная частка будынка або загаловак кніг Васіля Быкава і Сакрата Яновіча, 3. галава французскага гарадскога кіраўніцтва, 4. учынак, або частка драматычнага твора, або юрыдычны дакумент, або мастацкі нудысцкі сюжэт, 5. румынская грашовая адзінка, 6. хлебнае зерне для вырабу белай мукі, 7. костачка з мікраэлектроннай схемай, 8. член кроўнай радні або літаратурнае прозвішча Канстанціна Стаповіча, 9. грашовая адзінка Албаніі, 10. службачы на дзяржаўнай пасадзе, 11. псеўданім Іосіфа Джугашвілі, 12. дзяржава з Дамаскам. **(ш)**

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — застольнае выслоўе.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 11 нумара**

Рыба, казна, мутацыя, выбары, чайнік, вырадак, аер, пелікан, Гайнаўка, лёд.

Рашэнне: **Туман звычайна бывае перад адлігай.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Анне Кандрацюк** з Нараўкі і **Марку Парэмбскаму** з Валіл-Станцыі.

# 24.04 – 30.04

**Баран (21.03. — 19.04.)** Да 25-га адважныя, але не такія і рызыкоўныя рашэнні. Можа трапіць у твае рукі такое штосьці, дзякуючы чаму зможаш шмат чаго змяніць. Вынікі могуць быць ашаламляльныя, якія і ў снах не сніліся.

**Бык (20.04. — 20.05.)** Не ангажуйся ў сур'ёзныя фінансавыя інвестыцыі і не пазычай нікому больш грошай, можаш іх ніколі не ўбачыць. Не перабольшвай малых клопатаў. Добрых парад шукай у мужчын, асабліва Вадалеяў.

**Блізняты (21.05. — 21.06.)** Будзь асцярожны 24.04. Апазіцыя Юпітэра да Меркурыя (26 — 30.04.) будзе спрыяць пашыранню кола знаёмых. Сябры пазнаёмяць цябе з кімсьці, хто табе вельмі спадабаецца.

**Рак (22.06. — 22.07.)** Да 25.04. вялікае зацікаўленне тваёй асобай. 28 — 30.04. прабудзяцца твае творчыя сілы, узрасце пачуццё ўласнай каштоўнасці і, калі будзе трэба, паставіш на сваім.

**Леў (23.07. — 22.08.)** 28 — 30.04. прыйдуць у тваю галаву найлепшыя ідэі. Твая бліскучасць і неверагодная інтэлектуальная спраўнасць будуць уражваць. Надзея на прылоў у касе, магчымасць пашырыць сваю прафесійную дзейнасць.

**Дзева (23.08. — 22.09.)** Вялікая інтуіцыя ў фінансавых справах. Можаш сустрэцца з людзьмі бізнесу. 24.04. лепш не выбірайся на большыя пакупкі, пільнуй кашалёк і мабільнік.

**Шалі (23.09. — 22.10.)** Да 25.04. можа табе ўдацца штосьці неверагоднае. Пасля — перапалкі ў фінансах, можа чакаць цябе таксама невялікае расчараванне ў каханні.

**Скарпіён (23.10. — 21.11.)** Да 27.04. глядзі, каб не застацца на бабах, калі хочаш зашмат. Хадзі як ліс па крохкім лёдзе, уважліва ўзірайся, што дзеецца наўкола. Ідэя, якую падкіне табе знаёмы, будзе працэнтаваць у будучыні.

**Стралец (22.11. — 21.12.)** Устрымайся з рызыкоўнымі рашэннямі, не давярай усім і не павучай іншых. Не страчвай добрага настрою. Спешка і нецярплівасць могуць папсаваць табе планы. Могуць азвацца незалечаныя хваробы.

**Казярог (22.12. — 19.01.)** 25 — 29.04. адкрыеш у сабе вялікую глыбіню пачуццяў, якіх па сабе не паказваеш. Больш адкрыешся на партнёра. Выберыся на экскурсію, нават і за мяжу.

**Вадалей (20.01. — 18.02.)** Праніклівая інтуіцыя; можаш з іншай перспектывы глянуць на жыццё, нечакана знойдзеш развязку некаторых праблем. Можаш адчуваць сябе самотным, уцякаць у свет мараў.

**Рыбы (19.02. — 19.03.)** Павышаная ўражлівасць. Цяжка захаваць табе дысцыпліну, сістэматычнасць. Плыві з плынню падзей, разлічвай на выпадак, які — ніколі невыпадковы. Сімпатыя сяброў і іх цярплівасць памогуць табе дагаварыцца з атачэннем. Рашэнні, якія патрабуюць роздуму.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960